Ба 34535
Ба 81143

АДАМ БІЛЬДЗЮКЕВІЧ.

# АСНОВЫ ГРАМАДЗКАЙ ГАСПАДАРКІ

Б 81143
Бел. оддзел 1994 г.

ДЛЯ СЯРЭДНІХ ШКОЛ
І САМАНАВУЧАНЬНЯ.

ВЫДАНЬНЕ АЎТОРА
Перагледжана Беларускім Інстытутам Гаспадаркі і Культуры.

ВІЛЬНЯ — — — — 1926 г.

БЕЛАРУСКАЯ ДРУКАРНЯ ІМ. ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ
ЛЮДВІСАРСКАЯ 1.

# Прадмова.

Выпускаючы гэту працу перадусім маю на мэце даць пэўны сыстэматычны ўклад скарочанай эканомікі, які можа быць карысны як для лектара, так і для слухачоў гэтага прадмету. Навука грамадзкай Эканоміі ў навачасным жыцьці знаходзіцца так на высокай роўні, што ў гэтай скромнай працы немагчыма было ўсебакова і падрабязна абняць усе праявы грамадзкага жыцьця з эканамічнай галіны; закранутыя ў ёй пытаньні могуць аднак даць пэўную падгатоўку для далейшага студыяваньня і досьледу эканамічных зьявішчаў, прааналізаваных выдатнымі эканамістамі розных школ і выданых у чужаземных мовах. Магчыма, што ў недалёкай будучыні, калі будуць істнаваць адпаведныя ўмовы, вельмі бедная дагэтуль беларуская эканамічная літэратура ўзбагаціцца так высока цэненымі выданьнямі, што можна будзе з гонарам залічаць іх да раду заходня-эўропэйскіх.

Прадмет грамадзкай эканоміі зьяўляецца адным з неабходных прадметаў кожнай сярэдняй агульна-ўзгадаваўчае школы, бо ён дае сьветапагляд на структуру ня толькі гаспадарчага жыцьця, але і ўсяго грамадзкага ладу, якога найлепшы росквіт зьяўляецца мэтай усіх навук. Усе навукі прыродазнаўчыя і гуманістычныя апошняй сваей мэтай павінны мець дабро ўсяго грамадзянства. Калі аднак, некаторыя вынаходы ня йдуць на карысьць усяго грамадзянства, а зьяўляюцца аружжам адной нацыі скіраваным процiў другой, дык гэта сьведчыць толькі аб тым, што гэтыя вынаходы застасоўваюцца ня там, дзе яны патрэбны.

Бо калі-б, часова нейкая нацыя, дзякуючы пэўным вынаходам, магла надбіць іншыя нацыі і аблягчыць гэтым сабе далейшую бараньбу за лепшае істнаваньне, то гэтая часовая перамога павінна заўсёды кончыцца, дзякуючы ўзноў новым вынаходам з боку іншых народаў. Гісторыя пацьвярджае гэты сказ. Усе цяперашнія нацыі, на жаль ідуць старым шляхам, які ляжыць вельмі далёка ад агульна-чалавечых ідэалаў, ідэалаў росквіту ўсяго грамадзянства. Не памогуць тут вялікія буры і пераломы, якія нясець з сабой фізычная сіла, бо з гэтай сілай ня йдзе зьмена псыхікі грамадзян. Жыцьцё, аднак, будзе для ўсіх школай.

*Адам Більдзюкевіч.*

м. Вільня, у Жніўні 1926 г.

# Уступная часьць.

## § 1. Навука і яе падзел.

Людзкі розум ад давен-даўных часоў, ад самага пачатку істнаваньня чалавечага роду, цікавіўся акружаўшымі яго зьявішчамі і стараўся назнаць іх ужо толькі ў мэтах аблягчэньня сабе барацьбы з прыродай і пазьней у мэтах цывілізацыі і навуковага поступу. Сабраныя такім чынам здабычы людзкога розуму даюць у рэзультаце веду, якая ёсьць ня што іншае, як усе абаснаваныя інфармацыі, што датычаць якога-небудзь зьявішча або цэлай галіны зьявішчаў.

**Сыстэматычны ўклад усей нашай веды адносна пэўнага роду прадметаў, або зьявішчаў, ёсьць навукай.**

У эпоху невялікага разрозьненьня мысьлёвай працы істнавалі адзінкі (напр. Арыстотэль), якія ахоплівалі цэласьць тагочаснай веды. Аднак у меру таго, як матар'ял, здабываны навукай узрастаў і комплікаваўся, розум асобных людзкіх адзінак ня мог ужо грунтоўна апанаваць усяго.

Поступ веды, уварункаваны вялікай дакладнасьцю навуковага досьледу, вымагаў падзелу працы — спэцыялізацыі, — які давёў да распадзелу папярэдняга прадмету досьледу на часьці і спарадзіў многа асобных навук.

У зьвязку з гэтым паўстала клясыфікацыя навук, або падзел іх на групы на аснове супольных прыметаў.

Амаль ня ўсюды прынята цяпер дзяліць навукі на дзьве вялікія групы; для аднэй з іх прыняты тэрмін, **натуральныя навукі**, для другой назоў яшчэ дэфінітыўна (аканчальна) не ўстаноўлены, аднак называюць іх **гуманістычнымі навукамі** (homo—чалавек).

Натуральныя навукі маюць далей сваю дакладную сыстэматыку. Што да гуманістычных навук, то тут дакладную сыстэматыку правясьці трудней, з прычыны ўзаемнага пранікaньня дасьледжаваных навукай зьявішчаў. Хоць межы паміж рознымі навукамі ня ёсьць сталыя, аднак пазваляюць сьцьвярдзіць да якой навукі належыць пэўнае зьявішча.

Гуманістычныя навукі абнімаюць: Філёлёгію, Гісторыю, Соцыялёгію, Этыку, Права, Палітычную Эканомію, Навуку аб фінансах, Эканамічную Палітыку, Грамадзкую Палітыку і іншыя.

Соцыялёгія ёсьць навука аб усялякіх грамадзкіх праявах; этыка—аб абавязках чалавека; права — аб яго правох; эканомія—аб яго гаспадарчых патрэбах.

## § 2. Прадмет эканомікі.

Усе эканамічныя навукі можна падзяліць на тэорэтычныя і практычныя.

Да тэорэтычных належаць:

Эканоміка, якую прынята называць грамадзкай эканоміяй, калі яна разглядае грамадзкае гаспадараваньне, і палітычнай эканоміяй, калі прадметам яе ёсьць гаспадараваньне народу.

Гісторыя гаспадарчага разьвіцьця, якая падаець у гістарычным парадку разьвіцьцё гаспадарчых адносін.

Гісторыя эканамічных доктрынаў, якая разглядае гістарычнае разьвіцьцё эканамічных тэорыяў.

Да практычных эканамічных навук належаць: Фінансавая навука, якая разглядае гаспадарку праўна-публічных арганізацыяў (Гаспадарства, інстытуцыі камунальныя).

Грамадзкая палітыка, — рэгулюе т. зв. грамадзкія пытаньні, якія паўстаюць у грамадзянстве на грунце падзелу грамадзкага даходу. Палітыка эканамічная, каторая, апіраючыся на тэорыі эканомікі, займаецца сьведамым уплывам на гаспадарчыя адносіны.

Вышэй паданы падзел паказвае нам, якое месца займае палітычная эканомія сярод эканамічных навук. Можна сказаць, што прадметам грамадзкай эканоміі ёсьць адносіны, што паўстаюць між людзьмі на грунце заспакойваньня іх матар'яльных патрэбаў.

Назоў „Палітычная эканомія“ зьявіўся першы раз у 1615 г. у напісаным французам A. de Montchrétien творы „Traite d'economie politique“ (сыстэма палітычнае эканоміі).

Слова „эканомія“ было ўжывана за часоў старадаўных; тады грэцкія вучоныя пад гэтым словам разумелі хатняе гаспадараваньне (ойкос—дом, номос—права).

Аднак францускі эканамісты Montchrétien, дадаючы яшчэ слова „палітычная“, хацеў надаць навуцы новае значэньне і паказаць, што мае займацца ня прыватнымі справамі, а публічнымі.

Цяпер, калі даволі ясна даецца азначыць прадмет палітычнае эканоміі, навуку гэту можна называць проста эканоміяй, або эканомікай.



**Эканоміка гэта ёсьць навука аб зьявішчах і законах у грамадзкай гаспадарцы.** Францускі прафэсар Ch. Gide для грамадзкай эканоміі даець такое азначэньне: „Навуку грамадзкай гаспадаркі, званую таксама эканоміяй, або палітычнай эканомікай, можна здэфініяваць перад усім, як навуку аб істоце, прычынах, выніках і правілах гаспадарчых зьявішчаў“.

## § 2. Эканамічныя законы.

Так, як кожная навука, Эканоміка апіраецца на пэўных законах, якія абварункоўваюць істнаваньне кожнай навукі. Эканамічным законам называем прычыннасьць і залежнасьць паміж зьявішчамі. Эканамічныя законы ня маюць характару праўных нормаў, але даюць пэўную правіловасьць у чарзе гаспадарчых зьявішчаў.

Гэта правіловасьць, або парадак у пэўных галінах веды так відочна выступае, што нават няпрызвычаены да ўмелага разважаньня розум можа вельмі лёгка яго ўбачыць.

У тварэньні целаў арганічных і неарганічных бяруць удзел зьявішчы, якіх парадак настаўваньня, адных за аднымі ня так лёгка ўстанавіць. То-ж трэба было доўгіх вякоў, пакуль не ўдалося людзкому розуму, заблутанаму ў лябірынце ўсясьвету , схапіць пуцяводную нітку, знайсьці парадак і законы тых зьявішчаў і тым самым збудаваць такія навукі, як фізыка, хімія, біолёгія і т. п.

Пакрысе ідэя сталага парадку пачынае ўціраіцца туды, дзе на першы погляд, здавалася, што ёй няма месца, — да сфэры грамадзкіх зьявішчаў. Эканамістыя са школы фізыякратаў першыя ўгледзілі і абвясьцілі істнаваньне натуральных законаў у эканоміі. З эканамічных законаў, напрыклад, можна прывясьці закон Грэшама, які кажа, што калі ў абароце знаходзяцца дваякія законныя грошы, дык грошы добрыя выпіраюцца благімі; закон гаспадарчасьці, які кажа, што чалавек стараецца задаволіць свае патрэбы найлягчэйшай дарогай; закон цэнаў на вольным рынку і др.

## § 4. Навуковыя мэтоды.

**Пад навуковай мэтодай разумеем спосабы і дарогі навуковага досьледу,** — спосабы досьледу, пры помачы якіх стараемся адкрыць навуковыя законы, або парадак сьледаваньня зьявішчаў. Асноўныя мэтоды ёсьць дзьве: **дэдукцыйная і індукцыйная.** Дэдукцыйная мэтода прыймае пэўныя даныя за агульную аснову і пасьля дарогай лёгічнай консэквэнцыі творыць з яе цэлы рад асобных вывадаў. Тыповай навукай, якая карыстаецца дэдукцыйнай мэтодай,

ёсьць геомэтрыя. У геомэтрыі пэўныя даныя бяруцца за аснову, а з іх далей утвараюцца новыя вывады. У навуцы эканоміі лібэральная школа бярэць за аснову цьвярджэньне, што чалавек заўсёды стараецца атрымаць як найбольш карысьці коштам найменшых затрат і, прыймаючы яшчэ некалькі іншых доктрынаў, пасьля строяць на іх усю будову грамадзкай эканоміі.

Індукцыйная мэтода сочыць за асобнымі зьявішчамі і на аснове рэзультатаў сваіх абсэрвацыяў даходзіць да агульных вывадаў. Навукі прыродазнаўчыя і фізыка карыстаюцца гэтай мэтодай. У навуцы эканомікі таксама можна зьбіраць асобныя абсэрвацыі, якія могуць быць атрыманы з гісторыі і статыстыкі і, такім чынам, застасаваць індукцыйную мэтоду. Гэтай дарогай ідзець новая школа гістарычная, — або рэалістычная, зусім адкідаваючы дэдукцыю. Аднак сама індукцыйная мэтода досьледу ня можа даць у эканоміцы так вялікія рэзультаты, як у фізыцы і прыродазнаўчых навуках, бо перашкаджаюць гэтаму другія прычыны.

Перш-на-перш досьлед грамадзкіх зьявішчаў ёсьць шмат труднейшы. Ужо тое, што сам чалавек бярэ ўдзел у грамадзкім жыцьці, не пазваляе яму акуратна і бесстаронна прыглядацца да грамадзкіх зьявішчаў; апрача таго, досьлед гаспадарчых і грамадзкіх зьявішчаў бесканечна перавышае сілы адзінак, і можа быць праведзены працай вялікага ліку асоб, што зьбіраюць свае нагляданьні, або гаспадарственнымі (дзяржаўнымі) інстытуцыямі (зьбіраньне статыстычных даных). Другое, нават у прыродазнаўчых навуках чыстая абсэрвацыя ня выявіла-б такіх добрых рэзультатаў, каб не карысталіся там спэцыяльнай формай яе, вытваранай у штучных варунках, называнай экспэрымэнтам (спробай). У грамадзкіх навуках застасаваньне экспэрымэнтаў або зусім немагчыма, або бывае вельмі трудным. Хімік, фізык і нават біолёг заўсёды мае магчымасьць правясьці досьлед сярод пэўных штучных варункаў, якія па сваёй волі можа мяняць. Тымчасам эканамісты ня мае гэтай магчымасьці, ня можа паддаць эспэрымэнту праявы грамадзкага жыцьця. У грамадзкіх навуках мусім глядзець на зьявішчы так, як яны прадстаўляюцца ў жыцьці, ня маючы магчымасьці адзяліць іх ад сувязі з цэлым радам іншых зьявішчаў, з якімі яны разам выступаюць. Так, напрыклад, сьледзячы за прычынамі паніжэньня (спадку) валюты, мы ня можам цэлы край паддаць штучнаму экспэрымэнту і затрымаць хоць на адну хвіліну жыцьцё цэлай дзяржавы.

Пры досьледзе грамадзкіх зьявішчаў часам ужываюць абстракцыйную мэтоду, якая праводзе досьлед пэўнага зьявішча адрываючы яго ад цэлага раду другіх зьявішчаў, якія прыцямняюць або перашкаджаюць распазнаць дасьледжваемае зьявішча. Адна абстракцыя ня можа даць пажаданых рэзультатаў, ёй на дапамогу прыходзе гіпотэза.



І так запраўдная навуковая мэтода досьледу праходзе праз тры фазы. Першая фаза — гэта бесстароньняя абсэрвацыя (абгляд) зьявішчаў і то нават тых, якія на першы пагляд выдаюцца найпрасьцейшымі. Другой фазай ёсьць стварэньне агульнага абразу, на аснове злучэньня пэўных зьявішчаў у адносныя групы, якія астаюцца ў прычыннай лучнасьці паміж сабой, — Гэта фаза ёсьць тварэньнем гіпотэзы. Трэцяй фазай досьледу будзе праверка гэнай гіпотэзы, ці дарогай спэцыяльна праведзенай абсервацыі, ці, у выпадку магчымасьці, застасаваньнем экспэрымэнту.

## § 5. Людзкія патрэбы.

Пачуцьцё нястачы, злучанае са сьвядомасьцю неабходнасьці папаўненьня яе, называем патрэбай. Кожная істота, каб разьвівацца і дасягяць свае мэты, адчувае патрэбу помачы ад вонкавага сьвету. Неабходнасьць такой помачы павялічваецца ў меру ўзросту індывідуальнасьці істоты, пачынаючы ад расьлін або нават неарганічнага атому і канчаючы на чалавеку.

Чалавек змушаны адчуваць патрэбу ў вонкавых прадметах, уладаньне імі стварае пэўнае задаваленьне, адсутнасьць іх — цярпеньне. Для задаваленьня сваіх патрэбаў чалавек змушаны да гаспадарчай дзейнасьці. Людзкія патрэбы ёсьць фактычным пабуджэньнем да гаспадараваньня, а тым самым становяць выходны пункт навукі эканоміі. Патрэбы дзелім на фізычныя і духовыя, — індывідуальныя і грамадзкія, неабходныя і збытковыя, цяперашнія і будучыя і г. д. У межах свайго гатунку, патрэбы выступаюць з рознай сілай, у меру таго, ці мы іх часткай задаволілі, ці зусім не. Так напр. іншай будзе інтэнсыўнасьць голаду калі чалавек 2 дні нічога ня еў і іншай, калі ня еў некалькі гадзін. Род патрэбаў мае тое значэньне, што найвышэйшая ступень якасна — найважнейшай патрэбы абвяшчаецца з большай сілай, чым найвышэйшая ступень, якасна менш важнай патрэбы. Напрыклад, голад адчуваецца з большай сілай, як адсутнасьць кватэры. Ніжэйшыя ступені аднак у даны мамэнт могуць магутней даваць сябе адчуваць у менш важнай патрэбе, чым ніжэйшыя ступені патрэбы якасна вышэйшай, і гэтым тлумачыцца тое, што мы часамі заспакайваем збытковую патрэбу, а абмінаем больш неабходную, напр., ідзём у тэатр, замест купіць больш вопраткі. Дзеля гэтага, у грамадзкай гаспадарцы галоўнае значэньне мае інтэнсыўнасьць, з якой абвяшчаецца патрэба, а ня іх род.

## § 6. Гаспадарчае дабро.

Сродкі, якія служаць для заспакайваньня патрэбаў, **называем** дабром. Дабро бывае гаспадарчае і вольнае. Гаспадарчым дабром (res) называем дабро, якое заспакайвае патрэбы пасьля перадварэньня яго пры помачы працы. Дабро, якое ў натуральным стане заспакайвае патрэбы, называем вольным дабром (bona). Вольным дабром будуць тыя прадметы, якіх ёсьць так многа, што можам заспакоіць усе свае патрэбы і яшчэ астанецца шмат гэтых прадметаў, якіх мы ўжо ня можам спажыць (ужыць), бо не адчуваем нястачы; іншымі славамі, усе прадметы, якіх ёсьць за многа адносна да нашых патрэбаў, і якія ў натуральным стане могуць заспакайваць патрэбы, зьяўляюцца вольным дабром. Паветра, цяплыня сонца, вада, заяц у полі, рыба ў моры— будзе вольны дабром, але вада ў шклянцы, заяц у руках лоўчага, рыба злоўленая будзе гаспадарчым дабром. Дабро бывае трывалае і спажывальнае. Спажывальнае будзе тое дабро, якое пры аднаразовым задаваленьні патрэбы нішчацца (харчы), а калі дабро можа служыць на некалькі разоў на пэўны час (вопратка, кватэра) тады называем яго трывалым.

## § 7. Вартасьць.

Кожная рэч, якая можа заспакоіць нашы патрэбы, мае пэўную вартасьць.

**Вартасьць гэта ёсьць тое значэньне, якое мае гаспадарчы прадмет з тэй прычыны, што ён неабходны для задавольваньня патрэбаў чалавека.**

Маем вартасьць суб'ектыўную і аб'ектыўную, а кожную з іх дзелім ізноў на ўжытковую і паменную. У зьвязку з тым слова вартасьць зьмяшчае у сабе чатыры паняцьці: 1) **суб'ектыўна—ўжытковую** вартасьць, г. ё. значэньне, якое прызнае гаспадар дабру з погляду на свае ўласныя патрэбы; 2) **суб'ектыўна паменную** вартасьць, г. ё. тое самае значэньне з погляду на чужыя патрэбы, якія дарогай памену можна заспакоіць і ўзамен за гэта атрымаць іншае дабро; 3) **аб'ектыўна—ўжытковую** вартасьць, якая не ўваходзе ў рамкі навукі грамадзкай гаспадаркі, бо азначае толькі фактычную здольнасьць, г. ё. натуральную здольнасьць дабра да задавольваньня людзкіх патрэбаў; 4) **аб'ектыўна — паменную** вартасьць, або рыначную вартасьць, ці цану, якую можна атрымаць пры прадажы дабра. Найважнейшая ёсьць вартасьць суб'ектыўна-ўжытковая, бо ад яе залежаць усе іншыя вартасьці.



Вартасьць ня ёсьць паняцьце аб'ектыўнае, але суб'ектыўнае, бо месьціць у сабе перадусім пэўныя адносіны між чалавекам і рэчамі. У гэтых адносінах найважнейшую ролю грае чалавек, бо вартасьць ня ёсьць зусім зьвязана з самым прадметам або яго прыметамі, напр. з хімічным складам збожжа, з цьвёрдасьцьцю жалеза і т. д., але родзіцца толькі з' мамэнтам, калі будзіцца ў чалавека жаданьне прадмету і зьнікае, калі жаданьне гасьне. Пэўная рэч для аднаго можа мець нейкую вартасьць, тады, як для другога яна зусім ня мае ніякай вартасьці, хіба-ж толькі даная рэч можа быць абменена на іншае дабро. З гэтага вынікае, што вартасьць ёсьць паняцьце суб'ектыўнае, а не аб'ектыўнае. Бяз сумліву, калі нейкае дабро належыць да раду такіх, якое бяз перастанку заспакойвае людзкія патрэбы, напр. збожжа, жалеза, золата, то яно можа мець вартасьць для ўсіх праз цэлыя вякі, хаця і тут ня можна ручацца, што з часам ня будзе яно заступлена іншым дабром, якое будзе задавольваць нашыя патрэбы; ў кожным выпадку вартасьць данага дабра будзе мяняцца ў залежнасьці ад нашых жаданьняў.

Вартасьць, як вялічыня, або важкасьць, ёсьць паняцьце адноснае, а не абсолютнае. Падобна, як ня можна ніводнага цела назваць вялікім ці малым, каліб толькі яно адно існавала на сьвеце, так сама ня можам прызнаць высокай ці нізкай вартасьці, бо без параўнаньня ня можна яе вымерыць. А калі мы кажам, што пэўны прадмет, напр. дыямэнт, мае высокую вартасьць, то пад гэтым разумеем, што прадмет мае вялікую вартасьць адносна да монэтнай адзінкі. Вартасьць мае адноснае значэньне і гэта вынікае з таго, што ня можна гаварыць аб узросьце або спадку ўсіх вартасьцяў адразу. Каб адны маглі падняцца ўгару, дык патрэбна, каб другія спусьціліся ўніз.

Слова вартасьць яшчэ месьціць у сабе паняцьце рэдкасьці, гэта знача: ці пэўнага дабра, якога вартасьць нас цікавіць, ёсьць замнога, ці яго замала адносна да патрабаваньня; калі ёсьць цераз меру пэўнага дабра, то гэта дабро мае малую вартасьць або зусім яе можа ня мець.

Доказам гэтага можа быць вада для піцьця ў большасьці краёў, або вольная зямля ў краёх незаселеных. Чым больш колькасьць дабра прыбліжаецца да граніцы за якой ужо перавышае патрабаваньне, тым больш будзе зьмяншацца вартасьць, і чым далей будзе адходзіць ад гэтага пункту, тым барджэй вартасьць будзе большаць. Разумеюць гэта добра цяперашнія картэлі і трэсты, якія абмяжоўваючы вытвар пэўных тавараў, павялічваюць цэны.

Калі-б усялякага дабра было так многа, што ня толькі яго хапала-б на пакрыцьцё патрабаваньня, але яшчэ яго шмат аставалася-б, то ўсе прадметы ўтрацілі-б зусім вартасьць.

## § 8. Тэорыі вартасьці.

Пытаньне, адкуль бярэцца вартасьць і чаму жадаем аднэй рэчы больш, як другой, у працягу прошлага сталецьця цікавіла эканамістых розных напрамкаў. У зьвязку з гэтым паўстала шмат тэорыяў вартасьці, з якіх разгледзім тры найважнейшыя.

### 1. Тэорыі ўжытку.

Эканамістыя Тюрго, Кондыляс, І. Б. Сэй і іншыя цьвердзяць, што вартасьць паўстае, дзякуючы пажыткоўнасьці прадмету. Тое дабро больш варта, якое лепей можа задаволіць нашыя патрэбы, г. зн. якое ёсьць пажыткоўнейшым. З дзьвёх авечак большую вартасьць мае сыцейшая, з дзьвёх кватэраў выбіраем кватэру з болшым камфортам, з двух кавалкаў зямлі бяром больш ураджайны; а калі абодва прадметы могуць прынесьці аднолькавы пажытак, то яны маюць роўную вартасьць. Зусім ясна тэорыя пажытку, калі мы разглядаем два прадметы прызначаныя для заспакаеньня аднэй патрэбы; трудней справа прадстаўляецца калі два прадметы адказваюць інакшым патрэбам, напр. шапка і хлеб. Які з іх ёсьць пажыткаўнейшы? Можна-б было адказаць, што ўсе патрэбы павінны быць расклясыфікаваны паводле іхняе інтэнсыўнасьці і ў залежнасьці ад таго, якой клясе патрэбаў адказвае прадмет, такі яго будзе пажытак і гэтым самым знайдзена была-б яго вартасьць. Аднак гэтаму пярэчыць жыцьцё: ведаем добра, што збожжа, жалеза, вада, вопратка—гэта тыя прадметы, якія задавольваюць найнеабходнейшыя нашыя патрэбы, бяз іх цяпер людзі зусім ня могуць абыйсьціся, тымчасам золата, дыямэнты, антыкі маюць шмат большую вартасьць, хоць служаць толькі нашай цікаваасьці, задаваленьню збытковых патрэбаў. Каб выйсьці з гэтай недарэчнасьці другія эканамістыя прабуюць пажыткоўнасьць дапоўніць прынцыпам рэдкасьці. Тыя прадметы маюць большую вартасьць, якія могуць быць больш пажытковыя і рэдка спатыкаюцца. Дзеля таго; што дыямэнтаў ёсьць вельмі мала, дык яны маюць большую вартасьць як жалеза.

Далей, **псыхолёгічная, або аўстрыяцкая школа** (Мэнгэр, Бом-Баварк) мерыць вартасьць дабра скрайным пажыткам, або найніжэйшым пажыткам, які можа яно даць, ці яшчэ інакш—інтэнсыўнасьцю апошняй патрэбы, якую можа задаволіць дабро. Дапусьцім, што мы маем пяць вядзёр вады, з якіх адно прызначана для піцьця, другое мыць судзіны, трэцяе паіць каня, чацьвертае палівацъ кветкі і пятае мыць падлогу. Усе 5 вядзёр маюць задавольваць розныя патрэбы, аднак вартасьць усіх вядзёр адна і тая самая і будзе яна такая, якую мае вартасьць апошняе вядро вады. Бо калі-б мы першае вядро перавярнулі, то не адмовіліся-б піць, а ўзялі-б ваду з другога вядра, а памыць судзіны ўзялі-б ваду з трэцяга вядра і такім чынам нехваціла-б нам вады толькі памыць падлогу. Апошняя патрэба ня была-б задаволена, а дзеля таго вартасьць вядра вады мерыцца найніжэйшым пажыткам вядра вады, у гэтым выпадку вядра вады прызначанага мыць падлогу.



### 2. Тэорыі працы.

Не адкідаючы зусім пажыткоўнасьці тавараў, а прызнаючы пажыткоўнасьць толькі за варунак вартасьці, але не за яе прычыну, цэлы рад эканамістых вартасьць апірае на працы. Паводле *Адама Сміса* мерай вартасьці данага дабра будзе колькасьць працы, спажытай для яго вытвару. Дом больш варт як кватэра, бо больш працы пашло на збудаваньне дому, як на кватэру. Паўстае пытаньне, як мерыць вартасьць пэўнага тавару, калі адзін работнік працуе барджэй, (бо мае лепшую кваліфікацыю), а другі работнік павальней? Адказам на гэта ёсьць паняцьце грамадзка неабходнай працы. Давід Рыкардо кажа, што вартасьць дабра мерыцца колькасьцьцю працы грамадзка неабходнай для яго вытвару. Колькасьць грамадзка неабходнай працы ёсьць ня толькі жывая праца, спажытая пры вытвары новага дабра, але і праца ўперад сабраная, якая памагла пры дзейнасьці беспасрэдняй працы. Так, напрыклад, ганарар доктара мерыцца ня толькі колькасьцю працы, спажытай пры ложку хворага, але і той папярэдняй навуковай працай доктара, якая пазволіла яму паставіць дыягнозу.

Больш абаснована выясьняе вартасьць *К. Маркс.*

„Тавар толькі мае вартасьць дзеля таго, што ў ім ёсьць скрышталізаваная людзкая праца“. Вартасьць тавару мерыцца „колькасьцю зьмешчанай у ім працы, як тварца вартасьці. Мерай працы ёсьць час. Калі час, спажыты на вытвар тавару, акрэсьлівае яго вартасьць, то—так магло-б здавацца — чым больш лянівым і нязграбным ёсьць чалавек, тым больш вартасьці маюць яго тавары. Аднак-жа гэта ня так, бо справа не ў індывідуальнай, а ў грамадзкай працы. Таварнае вытвараньне ёсьць сыстэмай працаў выконваных, праўда, незалежна ад сябе, але ў грамадзкай лучнасьці. „Усялякая рабочая сіла грамадзянства, выказаная ў вартасьцях таварнага сьвету, лічыцца за адну і тую самую людзкую рабочую сілу, хаця складаецца з нязьлічаных індывідуальных рабочых сілаў. Кожная з індывідуальных рабочых сілаў ёсьць той самай людзкой рабочай сілай,

што і іншыя, калі мае характар грамадзкай, сярэдняй рабочай сілы, і як такая дзеець, а знача для вытвару тавару вымагае сярэдня-неабходнага або грамадзка-неабходнага часу працы. Грамадзка неабходным часам працы называем час працы патрэбны для вытвару пажытковай вартасьці ў істнуючых грамадзка-нармальных варунках вытвару, з грамадзка-сярэднім станам зграбнасьці і інтэнсыўнасьці працы“. Калі мяняецца прадукцыйнасьць (вытворчасьць) працы, дык падлягае таксама зьмене грамадзка - неабходны час працы і вартасьць“.

Паводле Маркса вартасьць мерыцца колькасьцю працы, грамадзка-неабходнай для вытвару данага дабра, або працай найніжэйшай, пры якой усе патрэбы рынку на гэтае дабро будуць задаволены.

Дапусьцім, што мы маем 3 катэгорыі шаўцоў, з якіх першая пры ужыцьці больш дасканальных прыладаў патрабуе 4 гадзіны для пашыцьця пары ботаў, другая 5 гадзін, а трэцяя 6 гадзін. Калі-б для задаваленьня патрабаваньня рынку патрэбна было столькі ботаў, колькі ўсе тры шаўцы могуць вырабіць, то вартасьць пары ботаў мерылася-б найніжэйшай працай трэцяй катэгорыі шаўцоў, г. зн. 6-цьма гадзінамі, а шаўцы першай і другой катэгорыі атрымлівалі-б рэнту. А калі, аднак-жа першая і другая катэгорыя шаўцоў пакрые ўсё патрабаваньне, то колькасьць грамадзка-неабходнай працы абніжыцца да 5-х гадзін і як гасцадарчы афэкт наступіць патаненьне ботаў адносна да іншых тавараў. Пры цяперашнім машыновым вытвары першая катэгорыя звычайна можа задаволіць усе патрабаваньне і гэта найніжэйшая колькасьць працы (чатыры гадзіны) ёсьць мерай вартасьці ботаў адносна да іншага гаспадарчага дабра. Усялякія тэхнічныя ўдасканаленьні выклікаюць абніжэньне колькасьці грамадзка - неабходнай працы, а разам і вартасьці твору.

### 3. Тэорыя прыемнасьці.

Паводле Кольсона вартасьць дабра мерыцца ступеняй пачуцьця прыемнасьці, якая дасягаецца пры задаваленьні патрэбы. Гэта тэорыя мае вельмі суб'ектыўны характар і ў яе найменш прыхільнікаў.

## § 9. Цана.

Вартасьць кожнай рэчы можна выражаць шмат якімі спосабамі. Гомэр ацэньваў зброю на сто валоў, японец, — яшчэ ня так даўно, сказаў-бы, што варта столькі а столькі цэнтнараў рыжу, чорны жыхар Афрыкі — столькі а столькі



мэтраў баваўнянага матар'ялу, паляўнік у Канадзе—столькі а столькі лісавых або выдрыных скурак, нарэшце эўропэец—столькі а столькі франкаў або рублёў. У кожным з гэтых выпадкаў іначай мерыцца вартасьць, але толькі ў апошнім з іх, дзе вартасьць выражана ў штуках золата або серабра, мае месца цана. Цаной называем вартасьць, выражаную грашмі. У зьвязку з тым, што ўва ўсіх цывілізованых краёх грашмі прынята мерыць вартасьць, слова „цана“ стала сынонімам вартасьці. Аднак-жа, цаны ня можна зьмешваць з вартасьцю. Калі цэны на два прадметы роўныя, дык гэта ня значыць, што яны маюць аднолькавую вартасьць.

Дапусьцім, што вартасьць каштоўных мэталяў зьмянілася, дык рэч ясная, што і вартасьць усіх рэчаў, выражаная пры помачы вартасьці гэтых мэталяў, мусіла-б зьмяніцца; г. зн. зьмянілася-б іх цана і то ў адваротных адносінах да зьмены каштоўных мэталяў. Калі-б золата патанела на адну дзесятую свае вартасьці, дык усе тавары падняліся-б у цане на адну дзесятую, г. зн. вартасьць быццам паднялася-б на адну дзесятую. З гэтага вынікае, **што кожная зьмена вартасьці грошай выклікае зьмену цэнаў у адваротных адносінах.**

Большы або меншы лік грошай ёсьць галоўным дзейнікам які ўплывае на іх вартасьць. Чым больш будзе грошай, як і кожнага тавару, тым меншая будзе іх вартасьць. Адгэтуль аснова: кожная зьмена ў ліку (колькасьці) грошай выклікае зьмену ў цане ў простых адносінах.

Паўстае пытаньне, ад чаго залежаць цэны на рынку? Рынчачнай цаною называем сярэднюю цану, якую за даны тавар можам атрымаць на пэўным рынку. Гэта цана ў першую чаргу павінна залежаць ад натуральнай цаны, або цаны коштаў вытвару. Далей патрабаваньне і посул уплывае на рынчачныя цэны; чым большая патрабаваньне і чым меншы посул тавараў, тым больш цэны маюць тэндэнцыю ісьці ўгару і наадварот. Вартасьць грошай таксама ёсьць адным з дзейнікаў ад якіх залежаць цэны на рынку. І так, не бяручы пад увагу іншых прычын, высокасьць рынчачнай цаны залежыць ад коштаў вытвару данага тавару, посулу і патрэбаваньня і ад вартасьці грошай. Павышэньне або паніжэньне цэнаў на рынку трымаецца пэўных граніцаў. Цэны могуць спасьці да коштаў вытвару, а нават і ніжэй, але на гэтак нізкім роўні доўга трымацца ня могуць, бо як цэны на даны тавар спадуць, дык ня будзе выгадна вытвараць гэты тавар, а як зьменшыцца яго колькасьць на рынку, дык цэны ўзноў будуць змушаны падняцца. А цяпер як высока могуць ісьці ўгару рынчачныя цэны? Пры вольным абароце тавараў конкурэнцыя зьяўляецца тым рэгулятарам, які не пазваляе вельмі высока паднімацца цэнам на тавары. Але калі тавараў ёсьць замала, каб пакрыць усё патрабаваньне

або калі купцы знаходзяцца моўчкі ў згодзе, ці арганізаваны ў картэлі, то тады вольная канкурэнцыя не патраціць рэгуляваць цэны. — Цэны могуць падняцца больш як на нармальныя процанты. Аднак граніцаї найвышэйшых цэнаў будзе купчая сіла консумэнта. Консумэнт, ня могучы купляць тавару, на які цана перавышае яго матар'яльныя сродкі, прызначаныя на задаваленьне пэўнай патрэбы або зрачэцца таго тавару, або будзе вытвараць тавар пры помачы прымітыўнейшых прыладаў. Можам тады сказаць, што цэны на тавар могуць падымацца да граніцы, пры якой аплаціцца вытвараць яго прымітыўнейшым спосабам.

З правам посулу і патрабаваньня не згаджаецца амэрыканскі эканамісты Moore (Мур) *); ён цьвердзіць, што ад павялічэньня посулу зусім не паніжаюцца цэны, і што наадварот павялічэньне цэнаў або прадбачаньне гэтага павялічэньня выклікае павялічэньне вытвару, а гэтым самым і ўзрост посулу тавараў. Ажыўленьне прамысловага вытвару якраз надходзіць тады, калі пачынаюць расьці цэны; узрост цэнаў пабуджае да большага вытвару, да большага посулу тавараў. У прамысловым вытвары выступае позытыўная корэляцыя між узростам ватвару і ўзростам цэнаў.

Зусім іначай прадстаўляецца справа пры цэнах на земляробныя прадукты; тут узрост посулу зьмяншае цану на збожжа.

## § 10. „Indeks numbers“.

У беспасрэднай сувязі з цэнамі стаіць паняцьце дарагоўлі. Дарагоўля гэта ёсьць нясумернасьць паміж рыначнымі цэнамі тавараў і сумай у спажыўцоў грошай прызначаных на куплю гэтых тавараў. У апошніх часох пытаньне дарагоўлі вельмі пачало цікавіць ня толькі тых, хто сам яе адчувае, але ўвесь навуковы і палітычны сьвет. Дзеля таго, што цэны на асобныя тавары не аднолькава падымаюцца, вельмі трудна адразу з'орыентавацца ў стане агульнай дарагоўлі. У гэтай справе на помач прыходзяць „indeks numbers“ — лічбовыя паказальнікі, на аснове якіх можна параўноўваць дарагоўлю ў розным часе і ў розных краёх, як на асобныя прадметы, так і на ўсе тавары разам узятыя.

Мэтода вылічэньня лічбовых паказальнікаў апіраецца на тым, што мы прыймаем цэны пэўнага пэрыяду часу за 100 і далей выражаем у процантах усялякія зьмены ў цэнах адносна да прынятаї асновы. Дзякуючы гэтаму можам лепей з'орыентавацца ў шыбкасьці і вялічыні зьмены цэнаў.

*) [illegible]



Конкрэтны прыклад найлепш гэта выкажа. Паводле статыстыкі ў Англіі на пшаніцу і гарбату былі такія гуртовыя цэны:

| | Пшаніца | Гарбата |
|---|---|---|
| Сярэдняя цана 1901 — 1915 год. | 30 шыл. | 6 пэнс. |
| „ „ у канцы 1913 году | 35.9 „ | 8¼ „ |
| „ „ „ 1921 году | 55.6 „ | 12⅝ „ |

На аснове гэтай таблічкі трудна параўнаўваць узрост цэнаў асобных прадметаў. Нам памагае ў гэтым мэтода паказальных лічбаў. Прыймаем цэны 1901—1905 году за 100 і ў процантах аблічаем цэны 1913 і 1921 г., тады атрымаем такую таблічку:

| | Пшаніца | Гарбата |
|---|---|---|
| Сярэдняя цэна 1901 — 1905 г. | 100 | 100 |
| „ „ у канцы 1913 г. | 119 | 137 |
| „ „ „ 1921 г. | 180 | 220 |

Пшаніца паднялася ў цане на 80 проц., а гарбата на 120 проц.

З гэтага відзім, што цана гарбаты ўзрасла болей як цана пшаніцы. Дадаючы паказальнікі асобных прадметаў і суму дзелячы на іх лік, атрымліваем агульны паказальнік гуртовых цэнаў, які дае нам дакладнае паняцьце аб узросьце (або спадку) цэнаў. Пасьля вайны бачым зьявішча „ножніцаў“, якое азначае, што цэны на прамысловыя творы падняліся шмат больш за цэны на земляробныя прадукты.

1-ая ЧАСЬЦЬ.

# ВЫТВОРСТВА.

## I. Дзейнікі вытворства.

### § 11. Функцыі грамадзкай гаспадаркі.

Цяперашняя грамадзкая гаспадарка праяўляе рад дзеяньняў, (функцыяў) скіраваных да задавольваньня нашых патрэбаў. Да функцыяў грамадзкай гаспадаркі належаць: 1) **Вытвараньне** гаспадарчага дабра, 2) **Зварот** — пераход дабра ад прадуцэнта да консумэнта, 3) **Разьмеркаваньне** (разьдзяленьне, рэпартыцыя) і 4) **Спажываньне** (консумцыя) гаспадарчага дабра *).

Пад вытворствам ня трэба разумець тварэньня гаспадарчага дабра. Чалавек ня можа ані стварыць, ані зьнішчожыць нават атому. Чалавек можа толькі зьмяняць выгляд або месца асобных часьцей матэрыі, якая акружае яго, мяшаць або лучыць гэтыя часьці і г. д. У кожным з вышэйпаданых выпадкаў, калі рабіць гэта сьведама і з мэтай наданьня той частцы матэрыі, над якой выконваем нейкую дзейнасьць, пэўных прыметаў, дзякуючы якім частка гэтае матэрыі робіцца пажаданай, або больш пажаданай, чымся была дагэтуль,—выпаўняем вытворчую дзейнасьць. Затым вытвар палягае на ператварэньні тае, што ўжо істнуе рэчы на іншую рэч, якая больш пажадана, бо барджэй або лепей задавольвае нашыя патрэбы. Само слова вытворства,— прадукцыя гаворыць аб гэтым: прадукцыя паходзе з лацінскага pro-ducere, што азначае выправоджваць. Словам, можам сказаць, што вытвараць што-небудзь, гэта знача рабіць магчымым задавольваньне людзкіх патрэбаў. Школа фізыякратаў цьвярдзіла, што толькі земляробства зьяўляецца вытворствам і што прамысловасьць, гандаль, грамадзкія паслугі і іншае ня вытварае гаспадарчага дабра.

*) Эканоміка консумцыі не разглядае



Аднак-жа, выходзячы з пункту гледжаньня, што вытворства азначае ператвараньне рэчаў, якія істнуюць, у рэчы, якія могуць лепей задавольваць нашыя патрэбы, дайдзем да вываду, што фізыякраты памыляліся, і што як земляробства, так прамысловасьць, гандаль, грамадзкія паслугі і іншае належыць да вытворства.

### § 12. Дзейнікі вытворства.

Пад дзейнікамі вытворства разумеем тыя неабходныя абставіны, якія мусяць браць удзел у вытворстве. Бяз іх ніякая вытворчая дзейнасьць немагчыма. **Дзейнікамі вытворства ёсьць: прырода, праца і капітал.** Кожны з гэтых дзейнікаў мае пры вытворстве іншае значэньне, аднак заўсёды ўсе тры выступаюць разам.

## А. Прырода.

### § 13, Прырода, як дзейнік вытворства.

Прырода дастаўляе чалавеку матэрыю, з якой ён карыстаець з мэтай задавальваньня сваіх патрэбаў. Ня толькі вытворства, але проста істнаваньне чалавека немагчыма, напр. бяз месца, на якім знаходзіцца чалавек, або без паветра, якім чалавек дыхае, і бяз іншых дароў прыроды. Гэтыя дары могуць быць даваныя прыродай дарма — ў гэтым выпадку яны ня носяць характару эканамічнага дабра (напр., паветра) — або, найчасьцей, чалавек карыстаець імі пры помачы ўласнай затраты энэргіі. Адносна да таго вялізарнага багацьця, якое крыецца ў лоне прыроды, чалавек яшчэ ў вельмі нязначнай меры карыстаець з сілаў і дароў прыроды; гэтак, напр., чалавек не патрапіў яшчэ выкарыстаць праз кондэнсатары сілы цяплыні сонца, не карыстаець з вялікай сілы прыліву і адліву мора і г. д.

З эканамічнага пункту гледжаньня багацьці і дары прыроды можна падзяліць на чатыры галіны: 1) клімат, 2) географічныя варункі, 3) зямля і пад'земныя багацьці і 4) цягучыя сілы (сіла ветру, спадку вады, пруткасьці газоў і інш.).

1. Кліматычныя варункі маюць дваякі ўплыў у галіне вытворства: а) уплываюць яны на магчымасьць разводу пэўных гатункаў расьлін і зьвяроў і б) на самога чалавека. У гарачай паласе магчыма разводзіць бавоўну, гарбату, цукровы трысьнік, вінную лазу і г. п., якія зьяўляюцца багацьцем данага краю, а нават пэўны род манаполю адносна да іншых краёў. Толькі сам прыгожы клімат, на ка-

жучы ўжо аб яго вытворчых варунках, можа быць крыніцай даходу для краю: чужаземцы зусюль зьяжджаюцца, напр. на Рыўеру (Францыя), дзе, калі можна так сказаць, прыгожы клімат прадаецца. Вельмі сьцюдзёны клімат не пазваляе расьціць збожжа. Клімат умяркавана-халодны (як у нас) не пазваляе на плянтацыі бавоўны, цукровага трысьніку і іншых карысных расьлінаў.

Гарачы клімат часта ўплывае на пэўную ацяжарнасьць насяленьня (напр. у нэграў) або на нахіл да гультайства (на поўдні Італіі); чалавек прызвычаены да цяпла і да карыстаньня з дароў прыроды без вялікай натугі, разгультайваецца. Вельмі халодны клімат утрудняе вытворства; скупая прырода вымагае ад чалавека большай працы; насяленьне халоднага клімату бывае беднае (эскімосы). Затым умяркаваны клімат найкарысьнейшы для вытворства, вырабляе ён у чалавека гарт, вытрымаласьць і прадпрыемлівасьць. Калі наш народ можа не зраўняўся яшчэ з іншымі народамі Эўропы, хаця і карыстаець з даволі адпаведнага клімату, то прычын гэтага трэба шукаць у іншых небагатых прыродных абставінах і ў умовах палітычнага характару, якія заўсёды перашкаджалі яму эканамічна разьвівацца.

2. Географічныя варункі маюць вялізарны ўплыў на характар прамысловасьці і яе разьвіцьцё. Цяперашняя буйная прамысловасьць і гандаль Англіі ў значнай сваей меры абавязаны таму, што В. Брытанія ёсьць востравам, паложаным пасярод мораў. Даўнейшая культура Эгіпту ў Афрыцы не магла распаўсюджвацца далей, бо трапляла на колёсальную пустыню ня выжалабенную морам.

3. Зямля мае вялікую сілу выдаваньня расьлін з зярнят. Гатунак зямлі адыгравае вялікую ролю ў земляробстве і ўплывае на род заняткаў чалавека.

Пад'земныя багацьці могуць быць асновай добрага эканамічнага стану краю. Англія, Нямеччына, Бэльгія ўдзячны разьвіцьцю прамысловасьці капальным мінэралам, а з іх пераважна каменнаму вуглю і жалезнай рудзе.

4. Цягучыя сілы прыроды дагэтуль яшчэ мала выкарыстаны чалавекам. У апошніх часох толькі паўстаюць праекты выкарыстаньня сілы вадаспадаў для электрафікацыі краёў. Сіла ветру выкарыстоўваецца яшчэ вельмі першабытнымі спосабамі, а сіла марскіх прыліваў і адліваў зусім ня выкарыстана.

Усе машыны, якімі цяпер паслугоўваецца чалавек, нішто іншае, як пераісточаньне цягучых сілаў прыроды: на пруткасьці газаў і вадзяное пары працуюць цяперашнія мотары і паравыя машыны, якія аблягчаюць чалавеку працу.

Асваеньне пэўных зьвяроў, як каня, вала, вярблюда, сланя, сабакі ў эскімосаў і г. д. дало людзям першую натуральную сілу, якую чалавек выкарыстаў да запражкі. Гэта было вялікай здабычай, бо зьвер шмат дужэйшы за чалавека. Сіла каня раўняецца 7 мужчынам, тады калі ўтрыманьне яго таньней каштуе. У Заходняй Эўропе сіла свойскіх зьвяроў ня мае так вялікага значэньня, як у нас, дзе конь зьяўляецца адзінай цягучай сілай для селяніна.



## § 14. Закон зьмяншэньня даходу.

У зьвязку з тым, што абшар зямлі, сырыя матар'ялы і цягучыя сілы знаходзяцца толькі ў агранічаным ліку, зьяўляюцца неабходнымі дзейнікамі ў вытворстве, ўсялякая вытворчасьць павінна калісь дайсьці да межаў, якіх немагчыма перайсьці. Найясьней выступае гэта ў горнай прамысловасьці. Як толькі капальня будзе выбрана, дык скончыцца вытворства данага мінэралу. Калі возьмем земляробства, то тут таксама маем пэўныя граніцы вытворства зямельных прадуктаў.

Кожны грунт заключае ў сабе пэўны абмяжованы лік мінэральных субстанцыяў, якія даюць корм расьлінам а кожнае жніво зьмяншае гэты запас, хаця павольна, але заўсёды і безперастанку. Бяз сумліву селянін можа ня толькі вярнуць зямлі гэтыя жыцядаўчыя дзейнікі, але нават і ўзбагаціць яе, ўкладаючы ў зямлю новыя хімічныя сувязі. Але ня трэба забывацца, што крыніцы, з якіх можна браць гэтыя карысныя дзейнікі, таксама абмяжованы, бо натуральны гной вяртае толькі часьць таго, што спажыло быдла, а хімічны навоз можа быць выраблены ў залежнасьці ад ліку мінэралаў, якіх ёсьць абмяжованая колькасьць.

Вытворства земляробскае абмяжована часам і прасторам, неабходным для жыцьця расьлін і жывёлы. Селянін чакае каб прырода сама закончыла пачатую ім працу ў залежнасьці ад законаў, якіх чалавек ня можа зьмяніць. Фабрыканта ня зьвязвае пара году: зіма, лета, дзень і ноч, ён можа весьці сваю працу круглы год, тады як земляроб мусіць датарнавацца да прыродных варункаў.

Затым, не падлягае сумліву, што лік прадуктаў з данага абшару грунту загадзя з пэўнай дакладнасьцю можна аблічыць, бо земляроб ня можа павялічыць да бесканечнасьці спагадных земляробству прыродных варункаў. Пры помачы павялічанай затраты часу можна атрымліваць з зямлі больш карысьці, але ўрэшце надойдзе час, калі-б усялякая натуга, уложана на павялічэньне даходу, была-б ужо непрапарцыянальна вялікай адносна да атрыманых рэзультатаў. Дапусьцім, што нармальна для атрыманьня 100 пудоў збожжа з данага абшару патрэбна 100 рабочых дзён. Калі-б мы хацелі атрымаць 200 пудоў з таго самага абша-

ру, дык патрэбна было-б ня 200 рабочых дзён а шмат болей. Хочучы падвоіць вытворства зямлі трэба можа патроіць, або ўчэцьвярыць ці ўдзесяцярыць лік працы і выдаткаў. Вось гэта й называем законам зьмяншаньня даходу.

Закон зьмяншаньня даходу кажа, што выдаткі на земляробства аплачуюцца толькі да пэўных межаў; за гэтымі межамі наклады не даюць ужо такіх самых рэзультатаў, але драбнеюць і могуць затрымацца на пэўнай (максымальнай) ступені.

# Б. Праца.

## § 15. Праца як дзейнік вытворства.

Працай у эканоміцы называем усялякую сьведамую натугу чалавека, маючую на мэце стварэньне эканамічнай вартасьці. Кожная жывая істота мусіць выконваць пэўную працу для задаваленьня сваіх патрэбаў. Навет насеньне мусіць сваею працаю падняць цьвярдую зямлю, якая прыкрывае яго, каб выйсьці на сьвет. Чалавек ня можа ўхіліцца ад агульнага закону і ён павінен працаваць каб задаволіваць свае патрэбы. Адны і тыя самыя дзейнасьці чалавека могуць быць або ня быць працай: падарож турыстага ня ёсьць працай, але тая самая дзейнасьць яго праваднiка ёсьць працай з эканамічнага пункту гледжаньня.

Неабходнай умовай працы ёсьць труд, палягаючы на ўнутраным або вонкавым прымусе. Гэты труд выплывае з неабходнасьці барацьбы са зморанасьцю, якая ўзрастае ў меру працягу працы. Праўда, што праца можа даваць унутранае задаволеньне, якога крыніцай ёсьць перамога самога сябе, але ня можна лічыць гэтага задаволеньня за галоўнае пабуджэньне да працы.

То-ж і імкненьні Фур'е да збудаваньня грамадзянства ў „фалянстэрах“ на грунце вольнай працы, выконыванай пастолькі паколькі праца спраўляе прыемнасьць мусілі быць фантастычнымі, бо няма працы бяз труда.

Праца ёсьць адным з дзейнікаў вытворства, г. зн. адной з варункаў (абставінаў), без якіх ня можа істнаваць вытворства.

Праца можа быць фізычнай або мысьлёвай (духовай). Гэты падзел толькі да пэўнаў ступені можна правясьці.

Няма працы зусім толькі фізычнай або зусім толькі мысьлёвай; у кожнай працы зьмяшчаецца дзейнасьць фізычных і мысьлёвых сілаў.

Дзелячы працу на фізычную і мыслёвую разумеем, што ў фізычнай працы пераважвае фізычная натуга мускулаў, а ў працы мысьлёвай пераважвае натуга мысьлі.



## § 16. Прадукцыйнасьць працы.

Праца ёсьць найпрадукцыйнейшая тады, калі выконваецца спраўна і скора. Спраўнасьць працы залежыць ад спэцыялізацыі ў ёй. Ад гэтага паўстала цяперашняя разнароднасьць прафэсіяў, бо ў цяперашняй вельмі скамплікаванай грамадзкай будове лепшае істнаваньне адзінак залежыць ад спраўнасьці працы. Работнік здольны да ўсяго найчасьцей ня мае працы, а спэцыялісты хутчэй яе знойдзе.

Найбольш прадукцыйнай ёсьць праца тады, калі пры выконваньні істнуе гэт. званы падзел працы. Падзел працы ёсьць у тым, што даная праца дзеліцца на некалькі прасьцейшых, з якіх кожную спаўняе асобны работнік (або асобныя групы работнікаў). Старонкікам падзелу працы быў ангельскі эканамісты Адам Сміс (A. Smith). Як прыклад А. Сміс апісвае хвабрыку шпілек: „Адзін чалавек — піша Сміс — хаця-б быў найзручнейшы, мог-бы напэўна зрабіць за цэлы дзень толькі адну шпільку, а напэўна не зрабіў-бы дваццацёх“. Але гэта праца падзелена на рад дзеяньняў: „адзін работнік выцягвае дрот, другі раўняе дрот, трэці тне (рэжа) яго, чацьверты завострава́е, пяты рыхтуе месца на дроце для галоўкі; прырыхтаваньне галоўкі зьяўляецца прадметам двох або трох спэцыяльных дзеяньняў... Фабрыка вырабляла ў дзень 48 тысяч шпілек, а на кожнага работніка прыходзілася 4800 шпілек у дзень. А каб кожны з іх працаваў асобна, тоніводзін не зрабіў-бы дваццацёх, а можа нават ані адной. Такі ёсьць вынік падзелу працы. Падзел працы павялічвае зручнасьць у працы, дае магчымасьць бардзэй працаваць, дае магчымасьць карыстацца слабейшымі сіламі (жанчын і хлапцоў) і сіламі людзей менш разьвітых мысьлёва; нарэшце падзел працы прыносе меншую псоту прыладаў (машын).

Пасрэднім вынікам падзелу працы (дзеля масовага вытворства) ёсьць таннасьць вытвару.

Апрача добрых старон падзел працы мае свае благія вынікі: 1) работнік, выконваючы заўсёды толькі адну і тую самую работу, робіцца да пэўнай меры аўтаматам, які зусім неразумее цэласьці вытворства; 2) часта слабейшыя сілы жанчын і дзяцей бываюць эксплёатаваны, што раскідвае сям'ю і выраджае работніцкую клясу; 3) карыстаньне з працы дзяцей перашкаджае іх навуцы; 4) работнік робіцца больш залежным ад прадпрыемніка або ад гэт. зван. гандлёвых коньюнктураў, бо, ўтраціўшы заработак (з волі фабрыканта, або дзякуючы выдуманай новай машыне, якая заступіць яго, або нарэшце дзеля браку патрабаваньня), можа не знайсьці працы, бо нічога, апрача таго, што рабіў, не патрапіць выконваць; 5) таннасьць вытвару (тым больш калі

ідзе з заступніцтва работніка машынай) найчасьцей не даець работніку ніякай компэнсацыі, бо выробляных ім тавараў зусім не спажывае, або спажывае вельмі мала і г. п.

# В. Капітал.

## § 17. Капітал, як дзейнік вытворства.

**Капіталам называем скрышталізаваную людзкую працу прызначаную да далейшага вытворства. Пад капіталам у эканоміцы разумеем усе прылады або сродкі**, якія бяруць або могуць браць удзел у вытворстве. З гэтага вынікае, што кожнае эканамічнае дабро можа быць капіталам. Вугаль спалены на фабрыцы пад катлом ёсьць капіталам, бо ёсьць там сродкам вытворства, той самы вугаль спалены ў прыватнай кватэры з мэтай беспасрэдняга задаваленьня нашай патрэбы ня ёсьць капіталам. Аб тым ці данае дабро ёсьць капіталам ці не, рашае яго прызначэньне.

Школа социялістычная дае зусім другое разуменьне капіталу.

Паводле Родбэртуса, Караля Маркса, Лясаля і інш., **капіталам ёсьць кожнае дабро, якое прыносе ўласьніку даход без працы.** Характарыстычнай адзнакай гэтай дыфініцыі ёсьць даход, або ўлада над чужой працай. Капіталам ёсьць ні што іншае, як толькі разуменьне праўнае, якое паўстала пры пэўнай форме вытворства і якое зьнікне ў сваім часе.

Запраўды-ж роля капіталу зьменівалася пад уплывам гаспадарчай эвалюцыі. Пачаткова скромныя прылады работніка, а пазьней капітал уцякае з рук працоўных і пераходзе да багатых. З прыладаў вытворства заменіваецца капітал у прылады прыбытку. Новы год, пры якім рэзультат (вынік) працы належыць не да работнікаў, а да ўласьніка капіталу, соцыялістычная школа называе **капіталізмам.** Калі-б на'т капіталістычны лад, які цяпер істнуе, ў будучыні зьнік, то сам капітал, як сродкі вытворства, заўсёды астанецца. Капіталізм пачаўся ў пэўным пэрыядзе ўжо добра разьвітага грамадзкага жыцьця і можа некалі скончыцца; аднак капітал істнаваў заўсёды і ніколі істнаваць не перастане, хаця яго роля ў вытворчасьці можа быць менш пераважваючай, будзе мець толькі значэньне сродкоў вытворства.

Капітал прыймае ўдзел у вытвараньні, а дзеля таго некаторыя думаюць, што кожны капітал прыносе даход так сама, як дрэва даець яблыкі, або курыца нясе яйкі. Такая роля патаемнай вытворнай сілы, якую прыпісваюць капіталу, ёсьць чыстай выдумкай. Ёсьць ведама, што грошы ніколі ня родзяць грошай, ані капітал капіталу. Ня толькі мяшок таляраў ніколі ня вытварыць ніводнага таляра, — як гэта ўжо сказаў Арыстотэль, але ані са стогу воўны, ані з бочкі жалеза не паўстала ані жменя воўны, ані адзін атом жалеза. А калі авечкі могуць пладзіць другія авечкі— як сказаў Бэнтгам, думаючы што забіў гэтым сказ Арыстотэля, — то зусім ня дзеля таго, што ёсьць яны капіталам, але проста таму, што ёсьць авечкамі, жывымі істотамі. Капітал-жа ёсьць матэрыяй бязуладнай і зусім бясплоднай, якая аблягчае вытворскую працу, але сама праз сябе нічога не вытварае.



Назоў „капітал" паходзе з сярэднявяковай лаціны (ад слова caput — галава — перароблена слова capitale — галоўная часьць), азначаўшай тады галоўную часьць пажычаных грошы, або, як цяпер кажуць, грашовы капітал, а не процанты. Пазьней гэты назоў прытарнавалі да паняцьця капіталу, бяручага ўдзел у вытворстве.

Капітал, разважаны з пункту гледжаньня прызначэньня яго ў вытворстве, дзелім на два сорты: 1) на закладны (ляжачы) і 2) на абаротны. Закладны капітал абыймае ўсе сродкі, якія патрэбны для залажэньня варстату вытворства, якія становяць аднаразовы накладны расход. Каб з'арганізаваць прадпрыемства, трэба мець зямлю, будынкі, прылады, машыны, і інш. Гэта будзе капітал, які адразу ня зношваецца ў працэсе вытворства, а будзе служыць даўжэйшы час. Вартасьць закладнога капіталу ўходзе да творанага прадукту толькі часьцямі ў залежнасьці ад таго, як доўга ён будзе служыць і колькі вырабіцца ў гэтым часе фабрыкату. Абаротны капітал, ў які ўходзяць сырыя матар'ялы, падможныя матар'ялы, апал, кошты ўтрыманьня будынкаў і інвэнтару работнікаў, — усе гэта беспасрэдна спажываецца на вытвар і абцяжвае яго цалком без падзелу.

Можна таксама капітал дзяліць на заўсёдны і зьменны. Зьменным капіталам будзе — капітал працы, рабочая сіла, творучая менную вартасьць. Зьменнасьць гэтага капіталу ёсьць у тым, што над коштамі работніцкай сілы стварае ён надвышку (лішку), якая робіцца для прадпрыемніка дадатковай вартасьцю (надвартасьцю).

Функцыя капіталу выступае пры вытворстве ў падвойнай форме: як зьбераганьне і ўмацаваньне людзкой працы.

Капітал ашчаджае чалавеку працу, даючы магчымасьць вытвараньня большага ліку дабра ў працягу таго самага часу, дык тым самым лікам працы, або іншымі словамі пазваляе вытвараць больш і барджэй. Адначасна капітал узмацняе людзкую працу, пры помачы яго можам налажыць ярмо на магутнейшыя сілы прыроды, або змагчы перашкоды, якія яна нам ставіць. Пры помачы капіталу вытворства робіцца лягчэйшым, бо перш - на - перш чалавек тым самым натугам можа вытварыць больш як раней, а па другое мо-

жа змусіць служыць сабе і гаспадарча выкарыстаць сілы прыроды, якімі, ня маючы адпаведных прыладаў і машын, ня мог-бы карыстацца. Дзеля тых самых прычын вытворства робіцца больш пладавітым (ураджайнейшым), бо абодва яго дзейнікі — праца і прырода — могуць вытварыць больш чымся ўперад. Нарэшце вытворства робіцца рознародным, бо капітал пазваляе чалавеку лягчэй апаноўваць сілы прыроды і тым дае магчымасьць тварэньня новых галін прадукцыі.

### § 18. Як творыцца капітал.

Капітал, будучы вытварам, як і кожнае іншае дабро можа ўзьнікаць ня йначай, як толькі пры помачы двух аснаўных дзейнікаў прадукцыі, г. зн. працы і прыроды. Досіць зрабіць перагляд усіх капіталаў: — прыладаў, машын, сырых матар'ялаў усялякіх сартоў — каб упэўніцца, што яны ня могуць мець іншага пачатку апрача таго, які толькі што азначылі.

Каб з вытваранага пры помачы працы і прыроды дабра паўставаў капітал, патрэбна каб гэта дабро зусім ня было спажыта, а каб часьць яго асталася. Іншымі словамі, капітал паўстае заўсёды дзеля таго, што лік вытваранага дабра перавышае лік спажытага. Лішка гэта можа паўставаць або дзеля таго, што вытворства ёсьць большае ад патрабаваньня, або дзеля таго, што консумцыя не заспакойвае ўсіх патрэбаў (ашчаднасьць). Паводле соцыялістычнай школы, капітал у цяперашнім відзе, паўстаў дзякуючы таму, што работнік працуе на фабрыканта больш чым атрымлівае на сваё ўтрыманьне ў форме заработнай платы; праца работніка творыць надвартасьць, якую пры прадажы прадукту захоплівае прадпрыемнік.

## II. Гісторыя грамадзкай гаспадаркі.

### § 19. Гаспадарчыя этапы.

У гістарычным развіцьці чалавецтва перайшло цэлы рад этапаў, пасоўваючы ўперад грамадзкую гаспадарчую дзейнасьць. Гаспадарчая дзейнасьць можа быць індывідуальная і грамадзкая. Індывідуальнае гаспадараваньне гэта самавыстарчальная замкнутая гаспадарка, пры якой усе патрэбы задавольваюцца пры помачы ўласнай працы. Грамадзкую гаспадарку ня трэба разумець, як суму індывідуальных гаспадарак, але як супольнае вядзеньне гаспадаркі ўсяго грамадзянства.



Грамадзкая гаспадарка праходзіла розныя этапы, пакуль дайшла да таго стану, які маем цяпер.

У самай першабытнай прошласьці, калі чалавек стаяў на найніжэйшай ступені культуры, ён задавольваў свае патрэбы кіруючыся самазахаваўчым інстынктам. У гэтым **этапе дзікасьці**, кінуты ў барацьбу з прыродай, жыў жыцьцём чуць не зьвярыным. Карміўся расьлінамі. Ня знаў жалеза, ня ўмеў здабываць дароў прыроднага багацьця, не перарабляў іх на яду і на карысныя прылады. Стаяў тады на ступені ніжэйшай за казачнага Рабінзона Крузо, той адзінкі гаспадарча адасобненай, выдзіраючы ўсё беспасрэдна з лона прыроды ўласнаю працаю і кемкасьцю, але абдоранай практыкай і спробамі цывілізаванага жыцьця.

**Эпоха паляўнічая і рыбалоўная** выказвае ўжо пэўны поступ. Народы знаходзяцца на першабытнай ступені гаспадарчай культуры, але паступаюць сьведама.

Паляўнічыя народы, жывучыя па лясох, арганізоўваюцца як асобныя роды і плямёны, задавальваючыя свае патрэбы паляваньнем, і трохі зьбіраньнем расьлін і пладоў. Сама прырода іх корміць. Апаноўваюць яе проста без падрабязнай працы — толькі фізычнай сілай і пэўным інстынктам адвагі. Няма тутака падзелу працы, гэтай галоўнай, як далей пабачым, асновы разумнага і сьвядомага гаспадараваньня. Ня твораць новага дабра, ня зьберагаюць гаспадарчых сродкаў. Жывуць радовымі і пляменнымі грамадамі ў камунізьме, г. зн. у супольнасьці гаспадараваньня і спажываньня. Няма ў іх разрозьненьня працы, дык і няма патрэбы розьніць групы на паноў, слуг і нявольнікаў. Духовае жыцьцё, заўсёды ўзалежненае ад гаспадарчага жыцьця, ёсьць ведама, мала разьвітае. Паступова-ж вырабляюцца тут ужо пэўныя роды працы, ператвараючай сырыя плады на дагаднейшую карысьць, аднак няма яшчэ ніякага сьледу мены твораў з іншымі гаспадаркамі. Гэтыя народы ёсьць качавыя, бо шукаюць штораз новых лясных ваколіц багатых зьвярынай.

Гэткі стан культуры істнуе і цяпер сярод дзікіх народаў. У дзявочных лясох жывуць дзікары з беспасрэдных дароў прыроды. Тубыльцы лясоў Бразыліі, хаця пачынаюць ужо абрабляць (урабляць) зямлю, але жывяцца пераважна паляваньнем. У гэтым рамясьле вырабляюць нязвычайны спрыт і хітрасьць, дасканальна знаюць сакрэты прыроды, галасы птушкі і зьвера, сьляды свае здабычы, але на гэтым канчаецца ўсё іх духовае разьвіцьцё. Наагул, аднак, у этапе паляўніцтва, як галоўнай форме гаспадаркі, чалавек пачынае мысьлёва працаваць. Хаця толькі апаноўвае тое, што

дае прырода, хаця сам не абрабляе зямлі і нічога ня вытварае, аднак застасоўвае ў сваей паляўнічай гаспадарцы пэўны парадак, сыстэму, бо прыгатоўвае сабе прылады, аружжа, сілы і адбывае ловы ў адпаведным часе.

**Рыбалоўныя народы** ў далёкай прошласьці жылі адначасна з паляўнічымі народамі, але ня супольна (ня ў лучнасьці). Таксама знаходзяцца яны на нізкай роўні гаспадарчага разьвіцьця і цывілізацыі. Засяляюць марскія берагі, берагі рэк і вазёр. Галоўная іх гаспадарчая праца гэта лоўля рыбы, пабач з якой другарадна займаюцца паляваньнем і зьбіраньнем пладоў. Маючы ў гэтай працы, лоўлі рыбы меншую натугу як у паляўнічых народаў, выпрабляюць у сябе ласкавейшыя звычаі і даўжэй утрымліваюцца на гэтай ступені культуры. Не качуюць, бо жывуць у густых натоўпах. Калі-не-калі паўстаюць у іх розьніцы станаў. Таксама як і паляўнічыя народы ня ведаюць замены дабра паміж іншымі гаспадаркамі. Калі перарабляюць натуральныя прадукты, то толькі на ўласнае спажыцьцё. Маюць ужо сеткі да лоўлі і апярэзваюць берагі вады загарадзьдзю з паляў. Пацьвярджэньне гэтага знаходзім у цяперашніх рыбалоўных народаў, жывучых у найпершабытнейшым стане культуры. Жыхары Агнёвае Зямлі валочацца ўздоўж берагоў выспы, кормячыся рыбай і марскімі жывёламі. Аднак робяць ужо рыбныя выправы, загароджваючы мелкія берагі. Тропічныя плямёны паўднёвай Амэрыкі, жывучыя рыбалоўствам, пры лоўлі застасоўваюць розныя затручаныя расьліны, каб адурманіць рыбу. З гэтага аказваецца, што і тут паўстае парадак гаспадараваньня, дыхтаваны спробамі жыцьця. Забіваньне рыбы стрэламі ўжо ёсьць вышэйшая ступень гэтага рамясла.

Рыбалоўныя народы, ў меру гаспадарчага поступу найчасьцей пераходзяць проста да формы зямельнай аселасьці, а часамі да вышэйшай формы марскога гандлю.

Паляўнічыя народы перараджаюцца ў пастухоўскія або адразу прыбіраюць форму земляробна-аселую.

**Пастухоўскія народы** прадстаўляюць ужо прадукцыйнейшую гаспадарчую натуру, вышэйшы арганізацыйны ровень. І яны выкарыстоўваюць галоўныя сілы прыроды, але мусяць стасаваць да іх дасканальнейшы, больш сьвядомы парадак мэтнай працы. Качуюць, але пераносяцца з месца на месца са сваімі стадамі жывёлы, шукаючы добрай пашы. Тут паўстаюць ужо ў асобных сем'ях розьніцы ў маемасьці. Некаторыя з іх, губяць сваю стаду, бяднеюць і заменьваюцца ў нявольнікаў. Гаспадарчы поступ ёсьць ужо тут вышэйшы, як у паляўнічых і рыбалоўных народаў. Лепей апранаюцца і лепш ядуць. Ужываюць скураную і тканую вопратку, зробленую ў сваёй гаспадарцы. Кормяцца ня



толькі мясам дзікіх зьвяроў, але пераважна жывёлаю сваей гадоўлі, ужываючы ў гаспадарцы агонь і цёплую страву. Калі нарэшце ўсталююцца ў пэўных выгадных ваколіцах, кідаюць качаўніцтва, пераходзяць да аселага земляробства.

**Асела-земляробскія народы** трудзяцца вытворствам расьлін і збожжа, займаюцца разам гадоўляй быдла. Лоўля ёсьць у іх дадатковым заняткам. Прывязваюцца да зямлі, якую абрабляюць. З зямлі маюць асновы быту і ў яе ўкладаюць усю карысную працу. З радоў паўстаюць тут самастойныя земляробскія воласьці. Спачатку пануе супольнае ўладаньне зямлёй. У гэтым грамадзкім уладаньні (камунізьме) розніцы выгадаў адзінак яшчэ не істнуюць, няма таксама рознасьці станаў. Ёсьць толькі права старшынства— патрымоніум (бацькоўская ўлада). Камуністычнае гаспадараваньне трывае даўжэй або карацей, але дзе-ня-дзе выступае ўжо прыватная ўласнасьць, якая адначасна бярэць у ярмо слабейшыя адзінкі, пападаючыя ў няволю паддан-ства і паншчыну.

Гаспадарчыя адносіны робяцца больш скамплікаваныя. Вытвараецца пачуцьцё грамадзкасьці, а ў далейшым разьвіцьці — дзяржаўнасьці. Супольныя воласьці, а таксама **прыўлашчаныя** гаспадаркі лучацца ў сувязі, пазьней у дзяржавы. Праца разрозьніваецца, наступае яе падзел, і родзяцца арганізацыйныя думкі. Праўда, галоўная праца дастаўляе зямельныя творы, і кожная сям'я вытварае толькі для сябе, але ўжо ў больш разьвітай гаспадарцы паўстае пачатак рамясла, хаця спачатку на ўласныя патрэбы.

Першабытным земляробным гаспадаркам гандаль яшчэ ня быў знаны, праяўляецца аднак натуральны памен (мена) прадуктаў на прадукты. Пасрэдніцтва грошай ня істнуе, але затое быдла, або скуры робяцца мерай вартасьці пры мене і служаць як першабытная форма грошай.

**Земляробна-рамесьленная эпоха**, як новы дасканальнейшы стан грамадзкай гаспадаркі, прыходзе на зьмену папярэдняга земляробнага этапу. Народы, ўмоцніўшы і палепшыўшы працу на ральлі, пашыраюць граніцы як сваіх патрэбаў, так і ўмеласьці. Вядуць горную прамысловасьць, рамясло і гандаль. Горная прамысловасьць робіцца нібы часткай земляробства. Рамясло паўстае з хатняе працы для пажытку замкнутай гаспадаркі. У зьвязку з тым, што ў земляробстве вытвараюцца ня толькі сырыя прадукты земляробства, а перакатвараюцца яны на муку, хлеб, прылады, тканіну і, што пачалі навучвацца кавальства, сталяркі, будаўніцтва і гт. п., дзеля таго людзкая праца пачынае прыбіраць характар профэсыянальнай умеласьці. Адразу замкнутая ў рамах хатняй гаспадаркі пасьля набірае што раз большай натугі і служыць іншым гаспадаркам, а нарэшце пачынае перараджацца ў працу на рынак. Месца, злучанае

з вёскай, у якой разьвілося гаспадарчае жыцьцё, робіцца рынкам збыту, г. зн. прадажы. Такія месцы, засьцярэжаныя ад нападаў з боку, ператвараюцца ў гарады (месты). Гандаль родзіцца з мены лішкі адных прадуктаў на іншыя, якіх у данай гаспадарцы мала. Места (горад) робіцца асяродкам усамадзельненага рамясла і памену, маючага характар грашовае мены. Наступае даволі дакладны падзел заняткаў на: землеробства, рамясло і гандаль. Усталяецца падзел працы і арганізацыя яе. Рамесьленьнікі часткова робяцца прадпрыемнікамі.

Да гэтай формы жыцьця за старадаўніх дзяржаваў даходзяць: Эгіпт, Бабілён, Фэніцыя, Пэрсія, Грэцыя, Картаген, Рым і інш. Эгіпт за 3000 гадоў перад Хрыстом меў ужо высокую культуру землеробства і рамясла. Места Бабілён было вялізарнаю сталіцаю і зьмяшчала многа насяленьня на прасторы 500 кв. кіл., або 1½ раза столькі колькі займае цяперашні Лёндан. Красаваў гандаль і ўжо ўжывалі залатыя і сярэбраныя грошы. Фэніцыяне сталіся піонэрамі гандлю ў суседніх народаў—таксама як і старадаўнія Пэрсы. Рымляне апанавалі ўвесь тагачасны сьвет, дзякуючы землеробна-гандлёваму поступу. Пазьнейшыя народы пасьля патопу цывілізацыі ў сярэдніх вякох, разам з узростам гарадоў прыбралі такую самую гаспадарчую форму. Мела яна пазьней асаблівы росквіт у Італьянскіх рэспубліках, у Голяндыі і Англіі, Францыі і Нямеччыне.

Вёска доўга яшчэ ўтрымлівалася ў формах натуральнай гаспадаркі, вытвараючай на ўласных і найбліжэйшых аколіцаў патрэбы. Але месты, робячыся рассаднікамі гандлю, пасоўваюць наперад эканамічную культуру, і—што за гэтым ідзе—агульную грамадзкую культуру. Гаспадарчыя поступы адначасна ёсьць тут пружынамі тварэньня дзяржаваў і іх узрастаючай сілы. Грамадзкія слаі розьняцца. Працуючы народ ёсьць у няволі ў паноў. У новай грамадзкасьці паўстае падданства і паншчына з частковай няволяй. Рамесьленніцтва вызвольвае работнікаў з гэтае залежнасьці, галоўным чынам тады, калі творацца цэхі. Але ў самых цэхах істнуе залежнасьць чаляднікаў а майстроў, якія часта выступаюць як прадпрыемнікі. Разрастаючыся ад XIII веку цэхова-фэодальны лад надае мяшчанству даволі вялікую здабычу ўлады. Цэхі прычыняюцца да значэньня гарадоў і да спэцыялізацыі рамясла. Аднак гэты лад мае свае вельмі непажаданыя бакі, бо робіцца крыніцай прамысловых манаполяў, якія да пэўнай ступені затрымліваюць поступ.

Цэхавы парадак, а разам з ім цэлы землеробна-рамесьленны лад становіцца разьбітым праз новае развіцьцё вольнага рукадзельля або т. наз. **мануфактуры**, якая ёсьць пераходным вогнішчам да буйна-прамысловых формаў. У XVI, XVII і XVIII сталецьцях, перадусім пад уплывам адкрыцьця Амэрыкі і морскай дарогі да Індыі, пасьля ўвахаду каштоўных мэталяў у гандаль і разросту міжнародных і заморскіх адносін, прыймае вялікія разьмеры гаспадарчае напружаньне. Вытворству зацесна ў межах цэхавога ладу. Яно шукае новых формаў і вальнейшай ініцыятывы. Зьяўляецца тады мануфактура, якая ёсьць прадпрыемствам працы ў вышэйшым маштабе, чымся рамясло. Мануфактура ўжо ўжывае большага ліку няцэхавых работнікаў. Дасканальна яна працуе на шырэйшы рынак. Цэхі пераважна чакаюць на замежныя заказы. Мануфактуры дзялілі кліентаў, г. зн. заказчыкаў, паводле сваіх галін вытворства, не дапушчаючы вольнай канкурэнцыі. Новая форма прамысловасьці знаходзіла ўсюды апеку ўрадаў, якія зусім разумна ўгледжвалі ў ёй паважнага дзейніка (фактара) дабрабыту, і адначасна парукі фінансавага разьвіцьця дзяржавы. Хаця з аднаго боку давалі волю вольнай ініцыятыве, то з другога, урады паклікалі да жыцьця сувязі новых прамыслоўцаў.



Ад мануфактурнай формы да **буйна-прамысловай** арганізацыі быў толькі адзін крок. Гэты крок вымагаў яшчэ іншых палітычных варункаў і большага поступу ў тэхніцы, што даканалася на парозе XIX сталецьця.

---

У залежнасьці ад таго, з якога пункту гледжаньня асобныя вучоныя цікавіліся разьвіцьцём грамадзкай гаспадаркі, далі яны розныя падзелы гісторыі гаспадараваньня.

Нямецкі вычоны Фр. Ліст дзеліць на станы: **дзікарскі, пастухоўскі, землеробны, прамысловы і землеробна-прамыслова-гандлёвы**. Гэты падзел праведзены ў залежнасьці ад роду працы, якую чалавек вёў для задаваленьня сваіх патрэбаў.

Бюшэр дзеліць на: 1) **самавыстарчальную, замкнутую хатнюю гаспадарку**, абапёртую на нявольнічай працы, 2) **мястовую гаспадарку з беспасрэдняй менай паміж горадам і вёскай**, і 3) **грамадзкую гаспадарку**.

Пры хатняй гаспадарцы ўсё, што самі вырабляюць, спажываецца на месцы; пры гаспадарцы мястовай выступае беспасрэдная мена тавараў паміж рамесьленьнікамі і вёскай; пры грамадзкай гаспадарцы мае месца шырокі таварны памен з пасрэднікамі, а вытворства апіраецца на капіталістычных асновах.

Шмолер дзеліць на гаспадарку: **вясковую, мястовую, тэрыторыяльную і гаспадарственную** (дзяржаўную).

Паводле К. Маркса істнавала 5 прогрэсыўных этапаў: **азіяцкі, старадаўні, сярэднявечны, новачасны і мяшчанскі.**

## § 20. Гісторыя работніцкае клясы.

Пры разгляданьні разьвіцьця грамадзкай гаспадаркі ў яе гістарычным парадку ёсьць важным здаць сабе справу з таго, як тварылася работніцкая кляса. Бо сувязь паміж гаспадарчымі інстытуцыямі і найважнейшым дзейнікам працы — работнікам — становіць адно з аснаўных пытаньняў экономіі. У прастарым паляўнічым і рыбалоўным быце і часткова пастухоўскім — пануе, як ужо ведама, комунізм, або супольнае гаспадараваньне ўсіх і роўнае карыстаньне гаспадарчым дабром. Няма тут паноў ані нявольнікаў. Пры земляробна-аселым ладзе, а тым больш, пры земляробна-рамесьленым, пад уплывам падзелу працы, паўстаюць ужо станы. Сярод іх труд беспасрэднай працы валіцца галоўным чынам на нявольнікаў і службу. У старадаўнім сьвеце нявольніцтва робіцца сыстэмай і правам працы. Аднак памалу падае, дзеля таго, што ня можа пагадзіцца з новай арганізацыяй і спэцыялізацыяй у працы, якая разьвіваецца ўжо ў Рыме. Пачуцьцё выгады вольнай працы і пачуцьцё людзкасьці выпірае нявольніцкую працу.

Калі Германцы, пасьля ўпадку рымскай дзяржавы заўладалі даўнымі яе землямі, дык нанова вытварыўся сялянскі стан. Тыя сяляне паступова прынялі вышэйшую форму раманскай гаспадаркі. Вытворства пры помачы нявольнікаў, істнуючы ў барбарскіх народаў, перастала быць у тым пэрыодзе сярод народаў, якія прынялі хрысьціянства. Замест няволі завялі асадніцтва зямельных працоўнікаў на ральлі. Але князі, біскупы і паны другім спосабам узаляжняюць сялян ад сябе. Накладаюць на іх абавязак чыншу (аплата за найманую зямлю) і службы на сваю карысьць. Вольныя сяляне ставаліся тады падданымі і паншчыннымі мужыкамі (халопамі). Пасьля абавязак розных паслугаў на карысьць панскай гаспадаркі пачаў узноў вырабляць прафэсіянальныя здольнасьці ў пэўных кірунках працы. Паказаліся чаляднікі, якія ўмелі выраблаць скуры, каваць аружжа, часаць дзерава, будаваць дамы і г. д. Гэтакім чынам, у хатняй гаспадарцы праяўляюцца пачаткі рамясла. Падчас вайны яшчэ бралі ваенных нявольнікаў, якія таксама працавалі службай, і якія пазьней спэцыялізаваліся ў рамясьле.

Спачатку рамесьленная праца адбывалася толькі для замкнутай гаспадаркі. Дзе асталіся сьляды даўнейшых рымскіх гарадоў, так, як у Італіі і ў паўднёвай Францыі, істнавала слаба разьвітае гарадзкое рамясло. Калі селянін і нявольнік выказаў спрыт у рамясьле, тады ўжывалі яго выключна да гэтай працы. Паступова ў меру разросту гарадзкога асадніцтва, амаль ня усё рамясло перанясьлося ў горад, а кожны, хто асеў ў горадзе, рабіўся ўжо вольным. Адначасна разьвівалася горная прамысловасьць і гутніцкая, як



рамясло адразу вясковае, да якога стасавана была праца сялян пад паншчынай. Аднак гэтыя працоўнікі атрымоўвалі пасьля надзел горных абшараў і вызваляліся. Тварэньне рамясла было тады прычынай да ўсамастойненьня слаёў работнікаў. Рамесьленьнік рабіўся прадпрыемнікам, незалежна ад сваіх сродкаў уладаньня. Умеласьць прафэсіі і спрыт у працы дадаваў яму самастойнасьці. Варстат ня быў дарагі. Пераважна выраблялі тавары з матар'ялаў, дастаўленых праз заказчыкаў, а нават пры працы на рынак ня трэба было мець вялікіх сродкаў.

Як настаў цэхавы лад у XII і XIII в. і пазьней, дык з цэхавых рамесьленьнікаў вырас новы прывілеяваны слой побач з даўнейшым мяшчанствам. Але ўжо далей у цэхавым ладзе паўстаюць найміты—чаляднікі. Варункі іх быту не заўсёды былі карысныя. Чаляднікі, або, як іх называлі, папіхачы (Knechte), хаця і аставаліся пад апекай цэхавога права, ня скора атрымлівалі самастойнасьць. Вызваленьне з тэрмінатараў на чаляднікаў і з чаляднікаў на майстроў было злучана з перашкодамі, бо цэх быў зайздросны за свой манаполь і праціўіўся тварэньню больш варстатаў. Супярэчнасьці паміж майстрамі і чаляднікамі штораз разрасталіся пры канцы сярэдніх вякоў. Калі лік чаляднікаў пры варстаце павялічваўся, пачалі застасоўваць плату ад штукі. Чаляднік ня меў дабрабыту, як гэта можа было на пачатку цэхавога ладу, але вёў змаганьне з прадпрыемнікам—майстрам, які хацеў з яго працы цягнуць найбольшы для сябе прыбытак.

Тэрмінатары і чаляднікі рабіліся часткова пралетарыятам. Новае разьвіцьцё мануфактурнага (рукадзельнага) ладу адразу аблягчыла пераход да вольнага рамясла. Чаляднікі, змагаючыся з прывілеямі цэхаў, заменьваліся на „партачоў“, або не прывілеяваных рамесьленьнікаў, а часткова ўступалі, як найміты, да багацейшых мануфактураў, якія пачалі ўжо паказвацца і мелі спэцыялістых—работнікаў. У гэтым пэрыядзе прылады вытворства адыгрывалі ў рамесьленнай працы другарадную ролю. Ня было яшчэ дарагой машыны. Вал паміж прадпрыемнікам і работнікам тады яшчэ ня быў вялікім. Пераход з найміта на ўласную гаспадарку даволі часта адбываўся без вялікіх перашкодаў. Ёсьць ведама, што тады не панавалі ідэальныя адносіны. Убогасьць і нэндза істнавалі і тады сярод працоўных. Агульная недаразьвіцьцё гаспадарчай працы не пазваляла павялічыць колькасьці дабра і задаволіць усе патрэбы. Уладаньне зямлёй шляхтай, або грашавымі сродкамі мяшчанствам, (якое вяло гандаль), брала верх над рукадзельнай працай.

Убогасьць гушчы (масы) была большая, чымся ў пазьнейшым капіталістычным ладзе. Але грамадзкія адносіны ў самым спосабе працы інакай укладаліся. Істнавалі маёма-

сныя супярэчнасьці, але менш увыпукленыя ў адносінах паміж прадпрыемнікам і работнікам.

Капіталістычны, або буйна-прамысловы лад, які далей апішам, стварыў вялікі слой найманых работнікаў, або пролетарыяту *). У капіталістычным ладзе машына, новая магутная сіла, спраўна — ня звычайна шыбка працуючая, пануе над грамадзкай гаспадаркаю. Выклікае гэта пераварот у цэлым парадку працы. Паўстае дарагі апарат недаступны для работніка, які ня мае капіталу. Дык родзіцца кляса прадпрыемнікаў сярод багатых, і яна ўстройвае прамысловыя прадпрыемствы, апёртыя на асновах удасканаленай тэхнікі. Рукадзельле, апёртае на прафэсіянальным спрыце работніка, ня можа вытрымаць канкурэнцыі з новымі прадпрыемствамі. Рамясло астаецца, але адыгрывае другарадную ролю. Цэлыя масы работнікаў паглынаюцца буйным промыслам. Ён наймае работнікаў і робіць з іх кіраўнікоў машыны, і яе памоцнікаў. Ёсьць тут зусім іншыя, чым раней, адносіны работніка да варстату працы. Варстат працы належыць да ўласьнікаў капіталу, а работнік атрымлівае толькі заработную плату. Дзякуючы машыне і падзелу працы, сільна ўзрастае вытворства гаспадарчага дабра. Узрост вытворства ня толькі ня плыве роўнай струёй на ўсіх, але вытварае контрасты паміж клясай прадпрыемнікаў і работнікаў. У самым грамадзкім ладзе, ўзалежняючым ад сябе падзел грамадзкага даходу, паўстае раздваеньне. Пад уплывам гэтага, работнікі пачынаюць арганізавацца для свае абароны, дамагаючыся перамен у адносінах працы. Гэта пабуджае публічную ўладу да рэформаў на карысьць работніцкай клясы.

Разам з буйна-прамысловым ладам да гаспадарчага пытаньня ўваходзе, як новы дзейнік, работніцкае пытаньне.

# III. Лад вытворства.

## § 21. Капіталістычны лад.

Капіталістычны або буйна-прамысловы лад у выразнай форме праяўляецца ў першай палавіне прошлага сталецьця, хаця раней грашовая гаспадарка палажыла ўжо фундамэнт пад яго зачаткі. Гэты новы пэрыяд грамадзкай гаспадаркі меў пружыны свайго разьвіцьця як у грамадзка-палітычных дзейніках, так і ў цэлым зборы новых гаспадарчых сіл. Француская рэвалюцыя вызваліла трэці стан з даўнейшай паняверкі. Праўная роўнасьць станаў і свабода адзінак аблягчыла арганізацыю гаспадаркі. Тады паўстаў вольны гандаль і вольныя прадпрыемствы. Знайшліся вялікія вынаходы ў форме тэхнічных удасканаленьняў, якія адразу пачалі прытарноўваць да прамысловасьці і камунікацыі. Месца даўнейшай мануфактуры або ручной прамысловасьці заняла машыновая прамысловасьць. Адкрыцьцё паровай сілы — вялікі вынаход Уатта — знайшло зьдзейсьненьне ў гутах, пасьля ў камунікацыі—чугунцы, а нарэшце і ўва ўсёй фабрыкацыі. Гандаль — абарот дабра — апёрся на шыбкасьці і лёгкасьці транспорту. Удасканалілі земляробства, прамысловую тэхніку, транспорт, гандлёвыя і крэдытовыя інстытуцыі. Вялікая колькасьць гаспадарчага дабра задаволіла і разнародзіла спажывецкія патрэбы, падымаючы культуру. Адначасна капітал, як улада над сродкамі вытвару, зрабіўся галоўнай сілай і імпульсам разьвіцьця.

Трэба ад'значыць, што перш за ўсё Англія пашла сьлядамі новага этапу. Яна ўжо мела прамысловыя традыцыі ў папярэднім этапе, ў якім была гарой над іншымі краямі разьвіцьцём вытвару і induction ператваральнем земляробных формаў на прамысловыя. Гэта было ў сувязі з цэлай гісторыяй Англіі. Тут найраней запанаваў вольны гандаль, тут насяленьне ўпрамысловілася духова, тут разьвілася навука эканоміі, і сьведамасьць яе законаў умацавалася ў грамадзянстве. Тут — што найважнейшае—найраней датарнавалі тэхнічныя вынаходы да патрэбаў прамысловасьці, камунікацыі воднай і сухапутнай; удасканалілі ангельскае гутніцтва і валакністы промысел. Прадзільныя і ткацкія мэханізмы, апёртыя на вынаходах Кауа, Arkwrighta; Cartwrighta (тварцоў тых машын) і іншых, пасунулі наперад адну з найвялікшых галін вытвару ўсяго сьвету. Калі вынаходы і іх практычнае ўжываньне рабілі ўжо поступы, калі ад гэтага прадпрыемствы і гандаль магутнелі, калі пачалі курсаваць паравыя караблі (1812 г.), калі мелі пайсьці чугункі дзякуючы вынаходу Стэфэнсона (1825 г.), паўстала ў Лёндане, а пасьля ў Манчэстэры агітацыя за вольны гандаль і гэты рух, дасягнуўшы перамогі, прычыніўся да разьвіцьця буйна-прамысловых прадпрыемстваў, даючы капіталу прынаду да ініцыятывы.

За прыкладам Англіі пайшлі іншыя краі. Францыя хаця не перасунула земляробства, як Англія, на другарадны плян, але ўмела побач з вырабам ральлі прысвойваць сабе буйна-прамысловую гаспадарку. Нямеччына, а асабліва Прусія давяла прамысловае разьвіцьцё да магутнасьці, сілкуючыся даганяць Англію, а нават выперадзіць яе ў палепшаньні тэхнікі ў буйна-прамысловых арганізацыях і ў зьбіраньні

*) Назоў гэты паходзе з лацінскага. Proles азначае патомства. Proletarius звалі чалавека, які ня быў у стане аплаціць найніжэйшага падатку, якога з пагардай называлі пролетарам, г. зн. плодзячым толькі патомства.

капіталу. У радзе буйна-прамысловых краёў сталі таксама Бэльгія, часткова Італія і Чэхаславакія, а побач з імі Злучаныя Штаты Амэрыкі зрабілі нязвычайны скок уперад на полі прамысловасьці, гандлю і банковай арганізацыі.

Прамысловасьць на беларускіх землях узрастала цішэй і пераважна была ў сувязі з земляробствам.

Фабрычны вытвар пачынаецца ўжо ад часу паўстаньня мануфактураў і сільна разьвіваецца ад ужываньня паравой машыны. Пры гэтай форме вытвару выступае працадаўца, які ёсьць уласьнікам капіталу і найміт, або работнік, даваючы сваю працу за пэўную плату. Дзякуючы вялізарнай перавазе капіталу над працай, пры падзеле даходу, атрымліванага з вытвару, называем апошні капіталістычным вытварам. Характарыстычнымі абставінамі капіталістычнага вытвару ёсьць: а) вялізарная перавага капіталу над працай, прадукт належыць да капіталістага, а работнік атрымлівае заработную плату на аснове вольнага найму; б) масовы вытвар на рынак, вытвар рэгулюецца патрабаваньнем; хочучы атрымліваць вялікія заработкі, капіталісты вытвараюць масы тавару ня лічыцца з патрабаваньнем, якое павялічвае штучна праз рэклямы, моды і вытвар тандэты; в) падзел працы і эканомія часу; вытвар робіцца таньнейшым, бо ў тым самым часе выраблюецца больш тавару.

## § 22. Конкурэнцыя.

Характарным зьявішчам цяперашняй гаспадаркі зьяўляецца вольнасьць вытвару і вольнасьць прадажы, з якіх паўстае вольная конкурэнцыя. Лібэральная школа вельмі многа надзеі клала на конкурэнцыю. Яна даводзіла, што конкурэнцыя: 1) імкнецца да паніжэньня цэнаў, (што ёсьць карысным для кансумэнтаў), 2) спрыяе разьвіцьцю вытвару і паўставаньню вынаходаў і дасканаленьняў тэхнікі і гандлю, 3) прыцягвае грашовыя капіталы, ажыўляючыя эканамічнае жыцьцё, 4) падбірае да адпаведнага роду працы найбольш здольных людзей.

Цяперака глядзім на вольную конкурэнцыю больш крытычна. Перш-на-перш вольная конкурэнцыя не заўсёды выклікае паніжэньне цаны, а нат даходзе да арганізацыі сындыкатаў (картэляў і трэстаў), якія запрапашчваюць зусім конкурэнцыю. Напрыклад, у Францыі ў пэўны час паўстала шмат пекарняў і хлебных крамак; рэзультат быў такі, што цана хлеба зусім ня ўпала, але многа пайшла ўгару, а гэта дзеля таго, што агульныя кошты кожнага пекара асталіся тыя самыя, але кожны з іх абслужваў меншы лік кліентаў, дык мусіў падняць цану, бо агульныя кошты павялічыліся; з гэтай прычыны консумэнты прыплачвалі 750 міль. франкаў у год.



Не заўсёды конкурэнцыя спрыяе разьвіцьцю вытварчасьці, бо няраз забівае слабейшыя арганізмы, якія маглі-б разьвівацца. Не заўсёды таксама вядзе да дасканаленьня тэхнікі і гандлю, бо часта накланяе конкурэнтаў да выперадак коштам гатунку тавару, або дарогай нячэснай меры, вагі і г. п. Бяз сумліву крыніцай усялякіх фальшаў у таварах ёсьць часта гэтая самая конкурэнцыя. Фальшаваньне тавараў, ёсьць ведама, ня спрыяе нармальнаму разьвіцьцю гаспадарчага жыцьця, але выраджае яго. Урэшце вольная конкурэнцыя не заўсёды спрыяе перамозе лепшых, часьнейшых адзінак, а наадварот, перамога часта бывае на старане тых, якія патрапяць лепей баламуціць спажыўцоў.

Шкоднасьць вольнае конкурэнцыі вельмі выразна выступае ў выпадку недахвату пэўнага тавару. Цэны тады на тэты тавар, быццам па змове ўсіх конкурэнтаў, ідуць шыбка ўгару і неадказваюць зусім коштам вытвару. Прыкладам гэтага ёсьць дарагоўля тавараў, якіх прыплыў на рынак агранічаны. У гэтым выпадку дзяржавы на'т у капіталістычным ладзе выступаюць з сваей інтэрвэнцыяй і ўстрымліваюць апэтыты конкурэнтаў.

Соцыялістычныя школы праціўны вольнай конкурэнцыі і лічаць яе злом ня толькі для консумэнтаў, але для ўсяго грамадзянства.

## § 23. Концэнтрацыя вытвару.

Датарнаваньне паравой машыны да прамысловасьці і ўдасканаленьне сродкаў камунікацыі прычынілася да паўстаньня і разьвіцьця вялікіх прамысловых арганізацыяў і вялікіх магазынаў (імкнучых да задаваленьня амаль што ня ўсіх чалавечых патрэбаў). Гэтыя магутныя арганізацыі могуць паўставаць дзякуючы вялікім абаротам і адносна меншым коштам, бо некаторыя кошты зьяўляюцца аднымі і тымі самымі, як у большым, так і ў меншым прадпрыемстве.

Напрыклад, на фабрыцы, якая мае 10.000 зл. абароту патрэбен адзін касіер і адзін бугальтэр, але ў фабрыцы, якая мае 100.000 зл. абароту досіць таксама аднаго бугальтэра і аднаго касіера, з гэтага на другоў фабрыцы будзе шмат менш фабрычных коштаў.

Да якіх разьмераў могуць даходзіць вялікія прадпрыемствы, сьведчыць аб гэтым напр. тое, што ўнівэрсальны магазын „Marshal Field" ў Чыкаго мае абароту ў год на 65 міл. даляраў, працуе ў ім 6700 прадаўцоў.

Кароль Маркс даводзе, што істнуе т. зв. закон концэнтрацыі прадпрыемстваў, палягаючы на тым, што па неабходнасьці рэчаў драбнейшыя прадпрыемствы заўсёды зьядаюцца і будуць зьядацца прадпрыемствамі большымі, аж

пакуль не надойдзе час, калі ўвесь вытвар будзе знаходзіцца ў малым ліку вялізарных прадпрыемстваў, якімі якраз тады вельмі лёгка заўладаць работнікам праз соцыяльную рэвалюцыю.

У самай рэчы, бачым, як у апошнія часы банкі зьліваюцца ў большыя інстытуцыі, бачым як гіне ўсялякае рамясло, уступаючы месца фабрычнай рабоце (напр. шавецтва).

Іншыя школы ня годзяцца з законам концэнтрацыі вытвару і як на прыклад паказваюць на вытвар зямельны, дзе ідзе цяпер парцэляцыя вялікіх абшараў, і на новыя вынаходы, якія могуць узноў павясьці да раздрабненьня вытвару.

## § 24. Эканамічны цыкль.

**А. Паняцьце аб крызысах.** Эканамічная вытворчасьць пераходзе ад часу да часу пэўныя пэрыяды хваробы — называныя крызысамі. Заўважылі, што такія крызысы ў часах нармальных бываюць кожныя 8 — 10 гадоў. **Эканамічныя крызысы гэта зьвіх раўнавагі паміж вытварам, а спажыцьцём эканамічнага дабра.** Прадстаўнік соцыялістычнай школы Энгельс характарызуе крызыс і гаспадарчы цыкль такімі славамі:

„Памен спыняецца, рынкі перапоўнены таварамі, якія масамі ложаць на складах без надзеі на збыт. Мэталічныя грошы чуць зусім не паказваюцца, зьнікае крэдыт, фабрыкі маўчаць, масова працуючым брак працы і спажывецкіх сродкаў... Банкруцтвы, ліцытацыі ёсьць на парадку дня, застой трывае цэлыя гады. Масовыя страты ў прадуктах і вытворчых сілах даводзяць урэшце да адплыву награмаджаных (назьбіраных) тавараў з меншай або большай утратай, аж пакуль вытвар і абмен узноў пачне функцыянаваць. Паступова падносіцца іх тэмп, пераходзе трушком, галопам, аж нарэшце ўзносіцца да неакелзаных скокаў у прамысловых выперадках, у крэдытных і спэкуляцыйных опэрацыях, каб пасьля гэтых каркаломных вынікаў зваліцца на ніз краху“...

Увесь гэты пераход гаспадарчага жыцьця ад ажыўленьня да крызысу, застою і ўзноў да ажыўленьня, называем гаспадарчым цыклем. Дык гаспадарчы цыкль праходзе праз ажыўленьне гаспадарчага жыцьця і яго застой. Крызыс зьяўляецца пераломным мамэнтам гаспадарчага жыцьця, пераломам ажыўленьня на застой — дэпрэсію. Сам перталом—крызыс цяпер праходзе спакайней бяз вельмі вялікіх матар'яльных шкодаў, якія былі выкліканы крызысамі ў апошнім сталецьці. Дэпрэсія палягае на тым, што пасьля пэрыяду сільнага гаспадарчага ажыўленьня трывае доўгі пэрыяд ціштыні — застою. Усе ўстрымліваюцца ад за-



купу тавараў, цэны нізкія, працэнтная норма нізкая, курс акцыяў нізкі, вытвар мінімальны, малыя абароты, лёгка атрымаць крэдыт, магазыны перапоўнены таварамі. Аднак дэпрэсія пасьля пэўнага пэрыяду часу пачынае сама вытвараць варункі, спрыяючыя паляпшэньню. Танны крэдыт і лёгкасьць атрыманьня яго цазваляе пускаць у ход прадпрыемствы. Тэхнічныя вынаходы, добры ўраджай, патрабаваньне на тавары і пэўны ўзрост цэнаў пабуджаюць прадпрыемнікаў да дзейнасьці. Паляпшэньне гаспадарчай конюнктуры ёсьць першым этапам ажыўленьня. Паўстае гаспадарчы оптымізм і надзея на атрыманьне прыбыткаў; ўзрастае патрабаваньне на тавары, цэны пачынаюць расьці; прадпрыемнікі пускаюць у ход фабрыкі. Дзякуючы ўзросту цэнаў павялічваюцца заработкі прадпрыемнікаў, што ўмацоўвае іх у што-раз большым оптымізьме. Спадзяваючыся далейшага ўзросту цэнаў разьвіваецца дзеяльнасьць ня толькі фабрыканта, але і спэкулянта, які стварае штучнае патрабаваньне на тавары. Паўстаюць новыя прадпрыемствы, і пераважна ў той галіне вытвару дзе зьяўляюцца тэхнічныя вынаходы. Ажыўленьне гаспадарчага жыцьця трывае датуль, пакуль ня зьявяцца перашкоды. Узрост цэнаў ёсьць першай перашкодай да ўзросту вытвару; пры канцы ажыўленьня цэны на сырыя матар'ялы і на рабочыя рукі растуць шыбчэй, чымся цэны на гатовыя тавары; ўзрастае працэнтная норма і на грашавым рынку наступае цесната. Заработкі штораз зьмяншаюцца, тэмп ажыўленьня пачынае слабець; оптымізм ператвараецца ў пэсымізм, закупкі зьмяншаюцца, тавараў аказваецца замнога, паўстаюць протэсты вэксалёў, крэдыт робіцца труднейшым; наступаюць крэдытныя рэстрыкцыі. Надходзе пераломны момэнт. Найскарэй рэакцыя наступае на біржы, акцыі пачынаюць спадаць. Упадак курсу акцыяў выклікае паніку, настрой панікі вядзе за сабой жаданьне вельмі шыбкай ліквідацыі інтарэсу, каб ўратаваць хоць штонебудзь. Разам з гэтым банкрутуюць прадпрыемствы, а нат' і банкі. У першую чаргу банкрутуюць новыя прадпрыемствы, якія паўсталі ў часе ажыўленьня, бо кошты вытвару гэтых прадпрыемстваў пераважна бываюць вышэйшыя як кошты вытвару старых прадпрыемстваў. Пасьля крызысу (ліквідацыі) наступае дэпрэсія, якая пераходзе ўзноў у ажыўленьне. Увесь гаспадарчы цыкль — пераход ад дэпрэсіі да ажыўленьня трывае цяпер больш-менш 8 гадоў *).

---

*) У Англіі крызысы былі ў г. г. 1812, 1818, 1825, 1837, 1847, 1857, 1873, 1884, 1890, 1893, 1903, 1907, 1910, 1913, 1920.

## Гаспадарчы цыкль на рысунку можна паказаць так:*)

**Росквіт.**

1. Цэны на высокай роуні.
2. Прамысловая вытворчасьць максымальная.
3. Будауніцтва зьмяншаецца.
4. Экспорт ніжэй, імпорт вышэй.
5. Заработная плата на высокім роуні.
6. Колькасьць забастовак узрастае.
7. Грундпэрства на высокім роуні, але паніжаецца.
8. Банкруцтвы мінімальныя.
9. Абароты разрахункавых палат на высокім роуні.
10. Напружаннасьць крэдыту.
11. Высокая працэнтная норма.

**Ажыўленьне.**

1. Цэны павышаюцца.
2. Прамысловая вытворчасьць узрастае.
3. Будауніцтва расшыраецца.
4. Экспорт паніжаецца, імпорт павышаецца.
5. Заработная плата узрастае.
6. Колькасьць забастовак зьмяншаецца.
7. Грундпэрства узрастае.
8. Банкруцтвы зьмяншаюцца.
9. Абароты разрахункових палат узрастаюць.
10. Лік крэдытных транзакцыяу узрастае.
11. Працэнтная норма павышаецца.




**Ліквідацыя (крызыс).**

1. Цэны паніжаюцца.
2. Прамысловая вытворчасьць паніжаецца.
3. Будауніцтва мінімальнае.
4. Экспорт павялічваецца, імпорт зьмяншаецца.
5. Заработная плата паніжаецца.
6. Лік забастовак павялічваецца.
7. Грундпэрства спадае.
8. Лік банкруцтвау узрастае.
9. Абароты разрахунковых палат паніжаюцца.
10. Агранічэньне крэдыту.
11. Працэнтная норма паніжаецца.

**Дэпрэсія.**

1. Цэны на нізкім роуні.
2. Прамысловая вытворчасьць мінімальная.
3. Будауніцтва мінімальнае.
4. Экспорт высокі, імпорт нізкі.
5. Заработная плата на нізкім роуні.
6. Забастоукі рэдка.
7. Грундпэрствы на нізкім роуні.
8. Лік банкрутцтвау вялікі.
9. Абароты разрахунковых палат на нізкім роуні.
10. Лёгка атрымаць крэдыт.
11. Працэнтная норма на нізкім роуні.

*) Гэты рысунак узяты ад Jordan'а (Business forecasting 1921).



У граніцах вялікага цыклю (8 гадовага) месьцяцця яшчэ меншыя цыклі, трываючыя каля 40 месяцаў.

Вялікі цыкль ёсьць агрэгатам 2—4 меншых цыкляў. Апрача гэтага бываюць яшчэ сэзонныя флюктуацыі (хістаньні) ў граніцах аднаго году.

Апрача вялікага і меншага цыклю існуюць яшчэ векавыя флюктуацыі (secular trend).

Графічна хістаньні (цэнаў, вытвару, абаротаў і інш.) зьвязаных з цыклямі можам паказаць як ніжэй:




T —— Векавая тэндэнцыя.
W —— Вялікі цыкль (8—10) гадавы).
m ········ Малы цыкль (40 месяцы).

З усяго вялікага цыклю найбольш зварочваюць на сябе ўвагу эканамістых і іншых самі крызысы.

Крызысы бываюць або мясцовыя або агульныя. У цяперашнім грамадзкім ладзе мясцовыя крызысы ўжо бываюць вельмі рэдка. Калі ў нейкай аколіцы наступіў неўраджай, даўней грязіў крызыс (мясцовы), цяпер дзякуючы добрай камунікацыі, мясцовыя крызысы ня ёсьць страшныя, але калі гэтая аколіца дастаўляе збожжа на ўвесь сьвет, то такі неўраджай можа пашкодзіць усяму грамадзянству. Аднак вельмі важная характарная старана крызысу ёсьць тое, што крызыс адной галіны вытворчасьці цягне за сабой крызыс іншых вытвараў. Сьцьверджана, што крызыс у вуглёвай прамысловасьці выклікае крызыс жалезнай прамысловасьці, якая паслугоўваецца вуглём. Крызыс крэдыту можа выклікаць крызыс вытвару і г. д...

Гаспадарчыя крызысы можна падзяліць на: 1) крызысы вытвару, 2) крэдыту, 3) гандлёвыя крызысы, 4) біржавыя і 5) спэкуляцыйныя. Крызысы вытвару могуць абымаць земляробскі і прамысловы вытвар.

**Б. Прычыны крызысаў.** Сталая (заўсёдная) раўнавага паміж вытварам і консумцыяй была ідэалам, які не даваўся ніколі зьдзейсьніцца. Аднак у эпосе дробнага вытвару і збыту на блізкіх рынках, пры наперад вядомым патрабаваньні, гаспадарчыя забурэньні выступалі, як вынік неўраджаяў, вайны і стыхійнай бяды. Капіталістычная эпоха з буйным

сваім вытварам, з разьвіцьцём камунікацыі, міжнароднага гандлю, чуць ня ставе крыж над голадам у пэўнай провінцыі. Гаспадарчыя прычыны крызысаў хаваюцца ў самым капіталістычным ладзе. Сярод гэтых прычын трэба ад'значыць вось якія: а) паяўленьне новых патрэбаў і шыбкі ўзрост насяленьня, якое вымагалаб заўсёднае арганізацыі вытвару і адпаведна да ліку рук для працы расшырала-б вытворчасьць; б) міжнародны гандаль, які ўтрудняе ўстанаўленьне раўнавагі паміж вытварам і кансумцыяй, в) разнастайнасьць ураджаяў, павялічваючых і зьменшаючых купчую сілу земляробскага насяленьня; г) спэкуляцыя разам з крэдытам і яго інстытуцыямі, аблягчаючымі спекуляцыю, ігру біржавымі паперамі і грундэрства г. зн. нерэальныя прадпрыемствы, аблічаныя толькі на сабраньне капіталаў; д) шыбкая будова чугункі, якая найбольш інтэнсыўна разьвівалася ў 7-мым дзесятку прошлага сталецьця, і абсорбавала (ўвабрала) вялізныя капіталы; е) беспляновась цяперашняй гаспадаркі, якая мае на мэце толькі прыватныя, якнайвышэйшыя заработкі; з) у рэшце непрапорцыянальны ўзрост вытворчасьці паміж асобнымі галінамі прадукцыі.

Ёсьць ведама, каб ня было церазьмернага ажыўленьня гаспадарчага жыцьця, то ня было-б і крызысаў, бо якраз крызыс ёсьць вынікам завялікага эканамічнага ажыўленьня-росквіту.

Цяперашні капіталізм, у меру яго разросту аслабляе тэмп крызысаў, пераход ад ажыўленьня да дэпрэсіі адбываецца спакойна. На гэта складаецца многа прычын. Перад усім концэнтрацыя прадпрыемстваў; прадпрыемствы маюць штораз больш капіталаў, могуць карыстаць з больщых крэдытаў нават у час гаспадарчага крызысу. Картэлі і трэсты даводзяць да арганізацыі вытвару і збыту. Вялікія сындыкаты рэгулююць вытвар сярод сваіх сяброў і цэны на тавары, апрача таго сындыкаты маюць адпаведныя арганізацыі *) да прадбачаньня гаспадарчай коньюнктуры, — патрабаваньня на тавары і магчымасьці іх збыту. Прычынай слабейшага тэмпу крызысаў ёсьць таксама разьвіцьцё крэдытных інстытуцыяў і вялізны ўплыў банковых капіталаў на разьвіцьцё прамысловасьці, — магутныя банкі займаюцца фінансаваньнем прадпрыемстваў. Разумная крэдытная палітыка можа не дапускаць да церазьмернага ажыўленьня, а гэтым самым унікне крызысу і дэпрэсіі. Апрача таго вытворчасьць стараецца абайсьціся без пасрэднікаў пры збыце тавараў, што аблягчае прыблізнае аблічэньне патрабаваньня. Пасрэднікі-гандляры часта ствараюць штучнае патрабаваньне дзякуючы спэкуляцыйным закупам.

---

*) Інстытуты Досьледу Коньюнктуры.



**В. Тэорыі крызысаў.** 1) Гаспадарчыя крызысы ўжо даўно зварачваюць на сябе ўвагу тэорэтыкаў. Дзеля таго, што публічная опінія абвінавачвала машыны за надвытвар і пазбаўленьне працы цэлага раду работнікаў, эканамістыя з лібэральнай школы стараюцца вытлумачыць надвытвар натуральнымі законамі. **Давід Рыкардо, І. Б. Сэй і Мілль** даводзяць, што надпрадукцыя ёсьць доказам разьвіцьця сродкаў вытворчасьці і заможнасьці грамадзянства. Фактычна надвытвару няма, бо за прадукты заўсёды плацяць іншымі прадуктамі, бо ўсялякая вытворчасьць раскладаецца на элемэнты грамадзкага даходу, капітал ператвараецца на даход. Калі ў пэўнай галіне зьяўляецца надвытвар, то заўсёды выраўноўваецца меншым вытварам у іншай галіне. Адсутнасьць раўнавагі залежыць ад вонкавых прычын, такіх як, войны, неўраджаі і інш. Раўнавага вяртае дарогай натуральнага парадку, а багацьце краю заўсёды ўзрастае.

2) Праціўнікамі гэтай тэорыі дарог збыту зьяўляюцца **Робэрт Мальтус** і **Сісмонді,** якія стаяць таксама на аснове абстракцыйных законаў прыроды, аднак у крызысах бачаць небясьпеку для эканамічнага ладу. Мальтусу крызысы выдаюцца доказам наступнасьці пералюдненьня. Дзе істнуюць церазмеру рабочыя рукі, там мусіць быць вытвараны церазьмерны лік прадуктаў праз зьбіраньне капіталаў у руках багацеяў. Сісмонді абвінавачвае беспляновасьць і самаволю цяперашняга вытвару, якія ствараюць надвытвар, дзякуючы зьмяншэньню грамадзкага даходу шырокіх масаў.

3) Эканамістыя з соцыялістычнай школы, як **Прудон і Бланк** (Proudhon i Blanc) бачаць прычыны крызысаў у факцэ прыватнай уласнасьці сродкаў вытвару і ў вольнай конкурэнцыі.

4) **Родбэртус** прычыну крызысаў бачыць у вельмі нізкай консумцыі працуючых класаў, якія ня могуць пасьпець за вытворчасьцю. Гэтая тэорыя вяжацца з пастаўленай Родбэртусам тэзай, што працуючыя масы не карыстаюць з павялічанай прадукцыйнасьці працы. Калі рэзультаты гэтай прадукцыйнасьці — тавары награмаджваюцца, як багацьце клясы ўласьнікаў, спатыкаюць вельмі малы лік консумэнтаў, ня могуць быць прадметам спажыцьця, але скарэй замяняюцца ў капітал, паваду ючы далейшае расшырэньне вытвару.

5. **Кароль Маркс** прычыну крызысаў бачыць у надвытвары капіталістычнае гаспадаркі, якая вытварае без наперад устаноўленага пляну, у залежнасьці ад вольных капіталаў на грашовым рынку. Тэндэнцыя капіталізму палягае на зьбіраньні капіталаў, якое зьвязана з церазьмерным і беспляновым вытварам.

Гэтае зьбіраньне капіталаў адбываецца дзякуючы т. наз. надвартасьці, якую затрымлівае сабе капіталісты ў зьвязку з нізкай заработнай платай і вялікім рабочым днём. Часьць гэтай надвартасьці робіцца новымі сродкамі вытвару тавараў, для якіх не хапае спажыўцоў, бо грамадзкі даход не павялічваецца, а зьмяншаецца.

Грамадзкі даход не павялічваецца дзеля таго, што надвартасьць — прадукт працы работніка— яго даход ператвараецца ў сродкі вытвару.

Паводле Маркса крызысы няўхільна зьвязаны з самым капіталістычным ладам.

Аб няўхільнасьці крызысаў праф. Л. Любімаў*) кажа так: „У разьвітым капіталістычным грамадзянстве крызысы бязумоўна няўхільны. Сапраўды. Рабочы атрымоўвае ў ім толькі частку тае вартасьці, каторую ён вытварыў. Гэта даказваецца прысутнасьцю істнаваньня дадатковае вартасьці. Таму ён, відавочна, ня можа купіць усяго, што ён вытварыў. Але быць можа ўсю рэшту могуць купіць капіталістыя?

Даволі невялікага разважаньня, каб пераканацца, што гэта зусім непраўдападобна. Капіталістыя, як правіла, не пражываюць усяго свайго прыбытку. Папершае, таму, што іх даходы да таго вялікія, што капіталістыя могуць ні ў чым сабе не адмаўляць, трацячы толькі частку. Падругое, іменна ўзаемная конкурэнцыя і проста „сьвятая прагавітасьць да золата", г. зн. жаданьне стаць яшчэ больш багатым, пабуджае капіталістых значна большую частку свайго даходу траціць „продукцыйна", г. зн. на набываньне новых сродкаў вытворчасьці і на пашырэньне апошняе. Гэта няўхільна даводзіць да далейшага росту вытворчасьці і да ўсё ўзрастаючае труднасьці для сусьветнага рынку ўвабраць такую масу прадуктаў. Рост „продукцыйнага" спажываньня капіталістых на час адцягвае крызыс, але затое потым, у скутку, яшчэ больш узмацняе яго, надае яму яшчэ большы разьмер і размах, бо павялічвае, ў канец канцоў, лік вытвараных продуктаў спажываньня. Мы ведаем, што вытворчасьць машын і г. д., мае значэньне ўсяго настолькі, наколькі яна павялічвае вытворчасьць прадметаў спажываньня. У праціўным выпадку мы мелі-б нейкую дзікую „вытворчасьць для вытворчасьці", нават без надзеі прадаць вытваранае, бо ясна, што наколькі грамадзянству не патрэбны больш, прыкл., тканіны, настолькі яно ня будзе купляць кросен і тых машын, каторыя робяць іх...

...Чым далей ішла концэнтрацыя вытворчасьці, тым мацней разьвівалася паказаная аснаўная супярэчнасьць

*) У перакладзе на белар. мову П. Зянюка.



капіталістычнага ладу, бо тым больш народу пачынала рабіць на адным прадпрыемстве. Вытворчасьць, значыцца, станавілася ўсё колектыўней і колектыўней, а спосаб прысваяньня пастарому заставаўся індывідуальным.

Відавочна, што ніякі грамадзкі лад ня можа доўга стаяць на тых прынцыпах (асновах), процілеглась між каторымі ўсё расьце і павялічваецца, як ні адзін чалавек ня можа доўга стаяць на тых дошках, каторыя ўсё больш і больш разыходзяцца. І лад, і чалавек у гэтым выпадку няўхільна ўпадуць.

Зьнішчэньне супярэчнасьці паміж гэтымі двума прынцыпамі, відавочна, магчыма толькі ў двух кірунках. Або спосаб вытворчасьці прыстасуецца да способу прысваеньня і таксама стане індывідуальным, або, наадварот, спосаб прысваеньня будзе прыстасаваны да способу вытворчасьці і таксама стане колектыўным, г. зн. прыдзе царства соцыялізму.

Першы спосаб значыць адмаўленьне ад усіх заваёваў тэхнікі, адмаўленьне ад буйнае вытворчасьці і зварот да вытворчасьці дробнае, індывідуальнае, асабістае. Ён, відавочна, і непажаданы і немагчымы. Імкнуцца да яго, гэта ўсё роўна, што шукаць разьвязваньня „супярэчнасьці" паміж чалавекам і адзеньнем, з каторага ён вырас у тым, каб старацца ізноў зрабіць яго маленькім. Застаецца, значыцца, адзін спосаб замірэньня гэтае супярэчнасьці: пашыць новае адзеньне або, ў стасунку да данага выпадку, зрабіць колектыўным ня толькі вытворчасьць, але і прысваеньне. Лад, заснаваны на такім эканамічным прынцыпе, называецца, як вядома соцыялістычным (комуністычным, колектыўным).

Значыцца, крызысы даказваюць, што асноўная супярэчнасьць капіталістычнага парадку, супярэчнасьць паміж способам вытворчасьці і способам прысваеньня зайшла так далёка, што капіталістычнае грамадзянства эканамічна ўжо асуджана на немінучую пагібель, дакладней на зьмену яго соцыялістычным ладам. Крызысы даказваюць, што прадукцыйныя сілы грамадзянства ўзрастаюць значна болей, чым яго пакупная здольнасьць, што попыт (выплатаздольнасьць) ня можа ўвабраць усяе тае масы тавараў, каторую вытварае капіталістычнае грамадзянства".

У другім томе „Капіталу" знаходзім зачаткі другой тэорыі крызысаў Маркса. Маркс цьвердзіць, што капіталістычны лад мае магчымасьць бесканечна расшырацца, ня гледзячы на тое, што грамадзкі даход масаў зьмяншаецца. Больш падрабязнае выясьненьне гэтай тэорыі даў Туган-Бараноўскі.

6. **Праф. М. Туган-Бараноўскі**, беручы за аснову другую тэорыю К. Маркса аб расшыраньні капіталістычнага вытвару да бесканечнасьці і аналізуючы ўмовы вытворчасьці ў Англіі, стварыў сваю тэорыю крызысаў. Ён кажа, што

Сэй і Рыкардо мыляліся калі цьвярдзілі, што консумцыя азначваецца вытварам, што капітал ператвараецца на даход. Паводле іх, вытвар зьяўляецца адначасна даходам працуючых і для іншай галіны вытвару, бо прадпрыемнік каб нешта вытварыць, мусіць купіць сырыя матар'ялы, мусіць наняць рабочую сілу, а затым выдаткаваны ім капітал зьяўляецца адначасна даходам для іншых. Туган-Барано̆скі аднак цьвердзіць, што ня ўся сума капіталу раскладаецца на элемэнты грамадзкага даходу, часьць гэтай сумы капіталізуецца і робіцца даходам нічыім.

Напрыклад, уласьнік поля вытварае землляробныя прадукты пры помачы 100 нявольнікаў. Вытвар прыносе 1000 адзінак земляробскіх прадуктаў, з якіх 200 ідзе на ўтрыманьне нявольнікаў, а 800 астаецца ўласьніку. Уласьнік пачынае лічыць, што яму выгадней будзе замяніць 50 нявольнікаў сілай каней і затым адпраўляе нявольнікаў (прадае) і купляе на іх месца 25 каней, якіх сіла перавышае ў 3 разы сілу 50 нявольнікаў.

Дзякуючы большай сіле рабочых каней, уласьнік з працы 50 нявольнікаў і 25 каней атрымлівае 1200 адзінак земляробных прадуктаў. З гэтага 100 адзінак ідзе на выжываньне 100 нявольнікаў і 25 адзінак на выжываньне каней. Такім чынам рабочая сіла каштавала толькі 125 адзінак, а ўласьніку асталося 1075. З гэтага відаць, што хаця агульны даход павялічаўся, даход работніцкай клясы зьменшыўся, пры тым часьць работнікаў асталася зусім бяз працы. Доказам таго, што агульны грамадзкі даход зьмяншаецца, хаця агульны вытвар узрастае, служыць тое зьявішча, што ў працягу XIX веку буйна-прамысловы вытвар павялічыўся ў вельмі вялікім тэмпе, тады, як вытвар артыкулаў масовай консумцыі (спажывецкія артыкулы, адзежа, боты), пайшоў угару толькі ў павольным тэмпе.

Туган-Барано̆скі перадусім шукае прычынаў крызысаў у самым вытвары, а не ў пэрыядзе абмену, падчас якога выступаюць крызысы.

Пры бесплянова́й капіталістычнай гаспадарцы, кожная галіна вытворчасьці разьвіваецца ў тым ці іншым тэмпе, але гэты тэмп бывае розны ў асобных галінах прадукцыі, іншымі словамі, вытворчасьць непропорцыянальна разьвіваецца. У пэўным пэрыядзе гаспадарчага ажыўленьня, дзякуючы непропорцыянальнай вытворчасьці, выяўляецца тое, што пэўных тавараў зьяўляецца на рынку шмат больш, чымся іншых, і што гэтыя тавары ня могуць быць заменены на іншыя. Такім чынам непропорцыянальны ўзрост вытворчасьці і зьяўляецца прычынай гаспадарчых крызысаў.

Хаця на фабрыцы існуе пляновая арганізацыя, але цэлая вытворчасьць ёсьць здэзарганізаванай і такой мусіць быць, бо новачасныя дзяржавы патрабуюць заграні́чных рынкаў, якія ўцякаюць з пад іхняга кантролю. Наперад ўжо пэўная часьць прадуктаў прызначаецца на вываз, бо ўнутраны рынак ня можа яе ўвабраць. На прыкладзе разьвіцьця Англіі Туган-Барано̆скі выказвае пэрыядычнасьць крызысаў, пры тым вострыя крызысы могуць быць спынены, а пэрыядычныя астануцца, бо ляжаць у самым сэнсе капіталізму.

7) **Діцэль** (Dietzel — 1905 г.) прычыны крызысаў бачыць у земляробстве. Павялічаны вытвар земляробных прадуктаў (добры ураджай) выклікае зьмену ў адносінах гаспадарчых сілаў, выклікае больш ажыўленую дзеяльнасьць прамысловасьці апёртай на земляробстве. Калі добры ўраджай выступае некалькі гадоў зразу, то ажыўленьне тым больш павялічваецца. Ажыўленьне вытвару апёртага на земляробстве вядзе за сабой ажыўленьне ў іншых галінах прамысловасьць, прамысловасьць вытвару капіталу: машынаў, прыладаў, жалеза, каменнага вуглю і інш. У рэзультаце ажыўленьне прамысловага вытвару вядзе за сабой гаспадарчы крызыс. Год неўраджаю не выклікае такога крызысу, як год ураджаю.

8) **Мур** (Moore) амэрыканскі эканамісты прамысловыя крызысы ўзалежняе ад земляробства. Ён цьвердзіць, што існуюць 2 цыклі: 1) аснаўны цыкль разьвіцьця земляробскай вытворчасьці і 2) выводны цыкль прамысловы. Падлічэньне выказвае, што ў Амэрыцы тры чацьвертые сырых матар'ялаў, якія перарабляюцца на фабрыках, атрымліваюцца з земляробскага вытвару. У зьвязку з гэтым ад флюктуацыяў сырых матар'ялаў з земляробства будуць залежыць флюктуацыі ў прамысловасьці. Флюктуацыі земляробскіх прадуктаў залежаць ад зьявішчаў космічнага характару. Існуе 8-гадавы цыкль атмасфэрных ападаў і залежыць ён ад руху плянэты Вэнэры. Большыя апады выклікаюць лепшы ўраджай і наадварот меншыя—горшы ўраджай. Вельмі добрыя ўраджаі мусяць выклікаць гаспадарчае ажыўленьне ў прамысловым вытвары. Павялічваецца патрабаваньне на капітальнае дабро: машыны, жалеза, вугаль, шыны і інш. і на рабочыя рукі. Пры благім ураджаі маем узрост беспрацоўя і эканамічны застой. Добраму ўраджаю заўсёды адказваюць нізкія цэны земляробскіх пракуктаў — паміж земляробным вытварам і цэнамі існуе нэгатыўная корэляцыя. Інача стаіць справа ў прамысловым вытвары. Павялічаны прамысловы вытвар заўсёды лучыцца з павышэньнем цэнаў, бо гаспадарчае ажыўленьне ня можа існаваць пры спадаючых цэнах. Такім чынам, паміж прамысловым вытварам і цэнамі на прамысловыя тавары існуе позытыўная корэляцыя. Гэтая тэорыя Мура зьбівае права посулу і патрабаваньня і даводзе, што разам з посулам растуць цэны на

прамысловыя тавары, хаця, праўда, патрабаваньне таксама ўзрастае.

9) **Ірвінг Фішэр** — амэрыканскі эканамісты, ў сваіх працах стараецца выказаць, што ў гаспадарчым жыцьці няма зусім цыклічнага разьвіцьця. Як час трываньня ажыўленьня, так і час дэпрэсіі ніколі ня бывае роўным; розьніцы ў працягу паміж асобнымі ажыўленьнямі даходзяць да некалькіх гадоў; статыстыка выказвае, што крызысы выступаюць пасьля розных пэрыядаў часу, ажыўленьне трывае ад 7 да 11 гадоў, дэпрэсія ад 1 да 5 гадоў. Затым няма ніякай асновы цьвярдзіць аб цыклічным разьвіцьці гаспадарчага жыцьця.

Хістаньне цэнаў зусім ня зьвязана з гаспадарчым цыклем, а залежыць толькі ад крэдытнай палітыкі. Гаспадарчы цыкль ёсьць, „танцам даляра“. Калі толькі крэдытная палітыка будзе стабільная (заўсёды такая самая), то тады ня будзе ніякага гаспадарчага цыклю. Апіраючыся на сваей тэорыі І. Фішэр прапануе ўвясьці тэорэтычную валюту, якая-б не апіралася на сталым ліку золата, але гэты лік зьмяняўся-б у залежнасьці ад хістаньняў цэнаў. Калі-б цэны ішлі ў гару, то тады трэба павышаць лік золата ў даляры і наадварот.

## § 25. Земляробскі крызыс.

**а) Зьмяншэньне закупной здольнасьці земляробскіх прадуктаў.**

Палажэньне, ў якім знаходзіцца пасьляваеннае земляробства, можам назваць земляробскім застоем — дэпрэсыяй.

У цяперашнім вытворчым ладзе, апёртым на індывідуальнай ініцыятыве, адзіным пабуджаючым да гаспадарчай чыннасьці дзейнікам зьяўляецца ахвота атрыманьня з свае працы якнайбольш заработку. Аканчальны аднак рэзультат працы, вартасьць твору не заўсёды залежыць ад самага напяцьця працы, а ад цэлага клубка прычын, якія неразрыўна зьвязаны з абаротам тавараў і ўмовамі вытвару. Дык тут паўстае пытаньне: ня колькі праца вытварыла тавару, а колькі вытвараны тавар варт на грошы? Чым большая будзе вартасьць тавару ў грошах, тым большая будзе ахвота вытвараць тавар. Рэч ясная, што з агульнай вартасьцю тавару цесна вяжацца яго цана, або вартасьць адзінкі (вагі, меры, штукі) гэтага тавару, выражаная ў грошах.

Гэтая цана на пэўныя прадукты зьяўляецца адным з самых чуткіх баромэтраў, якія гавораць аб палажэньні данай галіны вытвару, аб гаспадарчай конюнктуры, аб ажыўленьні, або застоі (дэпрэсіі) вытвару.

Пасьляваенныя цэны на земляробскія прадукты выразна гавораць нам аб застоі ў земляробстве, аб земляробскім



крызысе. **Земляробскі крызыс выяўляецца ў паніжэньні закупнае здольнасьці вялікіх і малых земляробаў, у спадку агульнай вартасьці земляробскіх прадуктаў.** Гэты спадак агульнай вартасьці зямельных пладоў у часах пасьляваенных наступіў так сільна, што земляробскае насяленьне мусіла перайсьці на горшае жыцьцё — зьбяднела. Бо, калі скажам, што перад вайной фабрычная вопратка, якую закупляў земляроб, каштавала 20 рублёў, то цяпер за такую вопратку трэба заплаціць каля 40 рублёў. Такім чынам цана вопраткі адносна да перадваеннага часу паднялася ў два разы, або на 100 проц. Адначасна з гэтым збожжа, жывёла і іншыя земляробскія тавары, калі не асталіся на перадваеннай цане, то падняліся вельмі мала, і ў кожным выпадку (за выключэньнем цаны малочных прадуктаў) не дaгaняюць цэнаў на тавары прамысловыя.

Выступаець тут зьявішча называнае „нажніцамі“, якія перад вайной былі зачынены, а цяпер раздвоіліся, так, што адзін іх канец знаходзіцца вышэй, а другі ніжэй; вышэйшы канец паказвае цэны прамысловых тавараў, а ніжэйшы — цэны прадуктаў земляробскіх. Дзякуючы таму, што цэны зямельных прадуктаў не адпавядаюць цэнам прамысловых тавараў і што гэтая розьніца прыпадае на карысьць прамысловага вытвару, гаспадарчае палажэньне земляроба шмат пагоршылася.

Каб купіць патрэбны яму фабрычны тавар, ён мусіць прадаць у два (а то і больш) разы больш прадуктаў свае працы, чым перад вайной. А дзеля таго, што земляроб ня змог на столькі павялічыць свой вытвар, каб магчы зраўняць розьніцу агульнай вартасьці пладоў свае працы, выцякаючую з прычыны розьніцы цэнаў прамысловых і земляробскіх прадуктаў — ён змушаны рабіць рэдукцыю сваіх закупаў, зьмяншаць ужыцьцё прамысловых тавараў. Адным словам, земляроб пачаў бяднець, і ў такой вялікай меры, што ня можа нават ён здавольваць самых неабходных патрэбаў, зьвязаных, з культурай і цывілізацыяй нашых дзён.

Статыстыка выказвае, што ў Польшчы ўжываюць цяпер толькі $^1/_3$ часьць ліку валакняных тавараў (мануфактуры), які быў ужываны перад вайной.

Селянін ня можа цяпер купіць лепшай вопраткі, ня можа справіць сабе ботаў, ня можа набыць земляробных прыладаў, штучных навозаў, лепшага насеньня, газы і інш., бо цэны на тавары яго працы не пазваляюць яму на гэта, а іншыя дадатковыя заработкі, у зьвязку з агульным застоем гаспадарчага жыцьця, для яго зусім ня істнуюць.

Можна думаць, што багацьце гаспадара залежыць ад ураджаю, або неўраджаю? Вот-жа хаця ўраджай і зьяўляецца пажаданым для земляроба, аднак не заўсёды прыносе ён з сабой канечна карысныя рэзультаты. Маем тут на ўвазе

земляроба, які вытварае земляробскіх тавараў больш чым іх спажывае ў сваёй гаспадарцы. Добры ўраджай можа для земляроба выказаць тры розныя рэзультаты: 1) калі агульная вартасьць земляробскіх прадуктаў павялічыцца — гаспадар пабагацее, 2) калі агульная вартасьць астанецца тая самая і 3) калі агульная вартасьць земляробскіх прадуктаў зьменшыцца — гаспадар пабяднее.

Возьмем прыклад для першага выпадку. Дапусьцім, што селянін вытварае нармальна ў сярэднім ліку 200 пудоў збожжа, з якіх 100 спажывае ў сваёй гаспадарцы, а 100 мае на продаж па цане 1 рубель. Прадаючы гэта збожжа, гаспадар атрымлівае 100 руб., атрымлівае 100 адзінак закупнай сілы, за якія можа набываць патрэбныя яму прамысловыя прадукты. Наступае, дзякуючы прыродзе, лепшы ўраджай і гаспадар атрымлівае 225 пудоў збожжа; ўраджай узрастае на 12 з пал. проц. 100 пудоў збожжа спажываецца на месцы, а 125 пудоў астаецца для прадажы. Калі-б цана збожжа асталася тая самая, то гаспадар атрымае за яго 125 рублёў, або 125 адзінак закупнай сілы. У гэтым выпадку гаспадар атрымае на 25 адзінак больш закупнай сілы і ў зьвязку з гэтым можа павялічыць свае закупы прамысловых тавараў. Палажэньне гаспадара палепшала, бо ён мае з прычыны лепшага ўраджаю большую закупную сілу, можа больш скарыстаць з прамысловых тавараў і можа пабагацець. Таксама гаспадар пабагацее, калі на'т цана на збожжа трохі спадзе, але будзе вышэй як 80 кап. за пуд.

Бяром цяпер другі выпадак, калі ў зьвязку з лепшым ураджаем цана на збожжа з 1 рубля спадзе на 80 капеек. У гэтым выпадку гаспадар, прадаючы 125 пудоў збожжа, атрымае 100 рублёў, або 100 адзінак закупнай сілы. Відзім, што агульная вартасьць ураджаю не зьмянілася, — як сярэдні нармальны ўраджай, так і лепшы ўраджай прыносіць гаспадару аднолькавыя карысьці. Гаспадар на добрым ураджаі нічога не зарабіў, яго гаспадарчае палажэньне не зьмянілася. Дзе-ж дзеліся тыя 25 пудоў збожжа, якімі прырода абдарыла гаспадара? Усе яны перайшлі да тых, якія закупілі ад селяніна збожжа, перайшлі да гарадзкога насяленьня задарма, бо гэтае насяленьне за тыя самыя грошы, за тую самую закупную сілу, купіла збожжа на 25 проц. больш пры лепшым ураджаі. У гэтым выпадку ўраджай палепшыў палажэньне людзей занятых прамысловым вытварам і зусім не зьмяніў палажэньня земляробаў. Закупная здольнасьць гаспадара асталася тая самая; можа ён закупляць прамысловыя тавары толькі ў такім ліку, як пры сярэднім ураджаі, патрабаваньне і ўжыцьцё прамысловых тавараў ня зьменіцца, астанецца тое самае.

Бяром цяпер трэці выпадак. Дапусьцім, што ў зьвязку з лепшым ураджаем, з большым посулам земляробскіх пра-



дуктаў, цана на збожжа спадае да 75 капеек. Прадаючы 125 пудоў, гаспадар атрымае 95 р., або 95 адзінак закупнай сілы. У гэтым выпадку, ня гледзячы на лепшы ўраджай, агульная вартасьць збожжа зьменшылася. Гаспадар атрымаў на 5 адзінак менш закупной сілы, палажэньне яго пагоршылася — ён пабяднеў. Уся надвышка лепшага ўраджаю, і яшчэ больш чым надвышка добрага ўраджаю, перайшла на карысьць насяленьня, занятага ў промысьле. Апрача таго гаспадар пабяднеў, ня можа ён ужо за 100 адзінак закупнай сілы купляць прамысловыя тавары, а толькі за 95, і такім чынам карыстаньне прамысловымі таварамі зьмяншаецца, зьмяншаецца патрабаваньне на прамысловыя тавары. Наступае нарушэньне раўнавагі між вытварам і ўжыцьцём, ўжыцьцём і вытварам у асобных галінах гаспадарчага жыцьця.

Як відзім, толькі ў адным выпадку добры ўраджай выйшаў на карысьць гаспадара, а ў двух на яго некарысьць.

Цяпер паставім сабе пытаньне, ці цэны зямельных прадуктаў могуць так многа спасьці, што агульная вартасьць добрага ўраджаю будзе меншая за агульную вартасьць сярэдняга ўраджаю? На гэта пытаньне дае патакуючы адказ Г. Кінг, які выясьняе гэта, асноўваючыся на такіх даказах:

Вартасьць кожнага дабра мераецца яго крайняй ужыткоўнасьцю, г. зн. інтэнсыўнасьцю апошняй (найменшай) патрэбы, якую можа задаволіць пэўнае дабро (тавар). Збожжа належыць да такога дабра, якое чалавецтва больш-менш у аднольковым ліку заўсёды спажывае. Скажам, калі работніку патрэбна штодзень 2 з пал. фунты хлеба, то каб яму давалі 3 з пал. фунты хлеба, то ён усяго хлеба не спажыўбы, а толькі патрэбны яму лік. Лішні фунт для работніка зьяўляецца зусім непатрэбным, хіба толькі для замены яго на іншае дабро. Там, дзе людзі недаядаюць хлеба, павялічэньне яго нормы будзе спаткана з адкрытымі рукамі, але-ж заўсёды такія людзі маюць замала сродкаў, каб магчы на'т па вельмі нявысокай (адносна) цане закупляць больш хлеба, як нармальна імі спажываецца. Сярэдня заможны чалавек заўсёды больш-менш спажывае аднальковы лік хлеба, ня гледзячы ці год быў больш ураджайны, ці мала ўраджайны (выключаючы галодныя гады). Адным словам, паграбаваньне на збожжа зьяўляецца мала элястычным, мала паддаецца вялікім хістаньням. Зусім другое з прамысловымі таварамі, якіх спажыцьцё знаходзіцца ў простых адносінах з багацьцем насяленьня; чым насяленьне больш багацее, тым пачынае больш спажываць прамысловых тавараў. Гэтага зусім ня можна сказаць аб земляробскіх прадуктах, якіх спажыцьцё можа павялічвацца толькі да пэўных граніц. У зьвязку з гэтым, калі настае ўраджайны год, то часьць ураджаю, надвышка над звычайнай сярэдняй нормай, ня

будзе мець спажыўцоў, якія-б таксама пажадалі спажыць гэту надвышку, як і сярэдня-патрэбную ім норму збожжа. Іншымі словамі, гэта надвыжка будзе задавольваць шмат інтэнсыўней меншую людзкую патрэбу; вартасьць гэтай лішкі збожжа для спажыўца будзе вельмі малой.

Калі нармальна пры сярэднім ураджаі была цана 1 руб., то пры добрым ураджаі гэтая цана шмат пойдзе ўніз, напр. на 75 кап., бо лішняе збожжа лічыцца мала вартым для спажыўца. Гэтае паніжэньне цаны можа пайсьці так далёка, што агульная вартасьць добрага ўраджаю будзе меншая за агульную вартасьць сярэдняга (горшага) ўраджаю. Гэтае зьявішча якраз мы бачым цяпер у Польшчы ў параўнаньні да 1924 году. 1925 год, згодна са статыстыкай выказвае на 20 — 30 проц. узрост ураджаю ў параўнаньні з 1924 годам. Але ці ад гэтага ўраджаю палепшылася палажэньне гаспадара? Не, не палепшала, а наадврот, яшчэ пагоршала. Калі-б цана на збожжа асталася з 1924 г. то, рэч ясная, што ўвесь ураджай пашоў-бы на карысьць гаспадара, але якраз цана ў процантах спала больш, чым у процантах падняўся ўраджай. Выкажам гэта такім рахункам. Дапусьцім, што ў 1924 г. гаспадар з ураджаю атрымаў 100 пудоў жыта, а ў 1925 г. 125 пудоў (ураджай падняўся на 25 проц.) У кастрычніку 1924 г. цана на збожжа была 3 зал. 50 гр., у 1925 г. у кастрычніку цана на жыта спала да 2 зл. 50 гр. Такім чынам вартасьць ураджаю 1924 году, які быў годам неўраджаю, становіць 350 зл., а ў 1925 г. павялічаны ўраджай становіць толькі 312 зл. 50 гр. З гэтага аблічэньня відаць (ня прымаючы на'т пад увагу спадку вартасьці злотага больш-менш на 18 проц.), што агульная вартасьць добрага ўраджаю зьяўляецца меншай за агульную вартасьць горшага ўраджаю. Лепшы ўраджай 1925 г. цалком, а яшчэ на'т з гакам (з пагаршэньнем палажэньня гаспадара) перайшоў на карысьць прамысловасьці, або іншых спажыўцоў.

Далейшым этапам нашага разважаньня будзе шуканьне прычын такога стану земляробскага вытвару і адказ на пытаньне, чаму на прамысловыя тавары цэны дарагія і чаму зямельныя прадукты танныя?

б). **Прычыны зьявішча „ножніцаў“ цэн земляробскіх і прамысловых тавараў.**

Перадусім трэба сьцвярдзіць, што цэны земляробскіх тавараў маюць міжнародны характар. Гэта знача, што, больш-менш, на ўсім сьвеце цэны на збожжа блізка падходзяць да аднэй нормы. Калі скажам, што ў Амэрыцы цана на жыта дасягае 3-х даляраў за 6 пудоў, то ў Англіі цана на жыта будзе блізкай да амэрыканскай цаны. Міжнародны характар цэнаў на земляробскія тавары тлумачыцца тым, што кошты



земляробскага вытвару, паміма пэўных розьніцаў у зямельнай культуры, зьяўляюцца між сабой блізкімі.

Другое, земляробскія прадукты зьяўляюцца прадметам вольнага міжнароднага гандлю. Гэтая вольнасьць выражаецца ў тым, што збожжа пераважна не падлягае аплаце мыта (cła) пры перавозе з тэрыторыі аднэй дзяржавы на другую. У Эўропе толькі Нямеччына і Францыя*) заводзіць мытную абарону на збожжа, накладваючы 5 — 7 марак на кожныя 100 кг. прывознага жыта. Наагул-жа існуе вольны гандаль збожжам, гандаль бяз мытных перашкодаў.

Зусім інакш стаіць справа з прамысловымі таварамі. Прамысловыя тавары не падлягаюць вольнаму гандлю. Кожная дзяржава, за выняткам Англіі (пасьля вайны і Англія пачынае ўводзіць абароннае мыта на прамысловыя тавары), абараняе краёвую прамысловасьць пры помачы вышэйшага або ніжэйшага мыта. Рэч ясная, што там, дзе ўведзена высокая мытная аплата на загранічныя тавары, адпаведныя тавары зьяўляюцца дарагімі. Такім чынам, у залежнасьці ад мытнай палітыкі і коштаў вытвару, цэны на прамысловыя тавары зьяўляюцца рознымі ў розных дзяржавах. Доказам гэтага можа быць такое параўнаньне. Самы добры касьцюм у Лёндане ў кастрычніку 1925 году каштаваў больш-менш 50 рублёў, тады калі ў Варшаве такі самы (а мо' і горшы) касьцюм каштаваў больш-менш 100 рублёў. З гэтага відзім, што Польшча ў гэтай галіне вытвару мае тавары даражэйшыя на 100 проц. за ангельскія. Зусім інакш прадстаўляецца справа са збожжам. Наадварот, цэны на збожжа ў Англіі стаяць вышэй, як цэны на збожжа ў Польшчы.

Доказам гэтага зьяўляюцца такія статыстычныя лічбы:

Цэны на збожжа ў кастрычніку 1925 году, ў злотых польскіх за 100 кг. (6 пудоў): **)

| | Варшава 12—17.X.1925. | Лівэрпуль (Англія) 5—10.X.1925 |
|---|---|---|
| 1. Пшаніца | 24,47 | 35,58 |
| 2. Жыта | 17,02 | — |
| 3. Ячмень | 20,09 | 38,83 |
| 4. Авёс | 18,67 | 26,83 |

Ня гледзячы на такія розьніцы, сусьветным ёсьць зьявішча спадку цэнаў збожжа пасьля вайны адносна да цэнаў на прамысловыя тавары. Сусьветныя цэны на збожжа ў пра-

*) Іншыя дзяржавы пачынаюць устанаўляць мыты на збожжа.

**) Wiadomości Statystyczne Głównego Urzędu Statystycznego z dnia 5 listopada 1925 r. Nr. 21.

цягу даўжэйшага часу ўзрасталі да 1873 году, далей, відзім спадак цэнаў, які трывае да 1895 году, а ад гэтага часу цэны на збожжа ідуць угару. У апошнім пэрыядзе якраз вельмі сільна разрасталася прамысловасьць, былі застасаваны вынаходы і палепшылі тэхніку вытворчасьці. Дабрабыт, як прамысловай так і земляробскай люднасьці ўзрастаў. Ад 1895 г. да 1914 г. былі стабільныя ўмовы. Цэны хаця і ўзрасталі, але як прамысловыя так і земляробскія тавары даражэлі ў пэўных сталых адносінах. Гэта значыць, што між лікам земляробскіх прадуктаў і лікам прамысловых тавараў істнавалі пэўныя сталыя адносіны, якія можна выразіць у лічбах 100 на 100.

Сто адзінак прамысловых тавараў у сусьветнай гаспадарцы раўняліся 100 адзінкам земляробскіх прадуктаў. А дзеля таго, што мы жывём у часе таварнай гаспадаркі, замены тавару на тавар пры пасрэдніцтве грошай, як меры вартасьці (крэдыт таксама), затым 100 адзінак прамысловых тавараў заменьвалі на 100 адзінак земляробскіх; адначасна з гэтым адпаведна ўстанаўляліся цэны на асобныя тавары. Цана аднэй адзінкі земляробскіх тавараў, раўнялася цане аднэй адзінкі прамысловых тавараў.

У часе вайны і пасьля вайны наступіла ўва ўсім гэтым зьмена. У вялікай меры зьменшылася прамысловая вытворчасьць, часьць прамысловых фабрык пачала працаваць спэцыяльна на ваенныя патрэбы. У часе вайны вытворчасьць прамысловых тавараў зьменшылася, бо не вярнулася да даваеннай нормы, чаго можа быць доказам вялікі лік безработных, якія да вайны працавалі на фабрыках, а цяпер зусім не працуюць. Адносіны даваенных 100 : 100 між лікам земляробскіх тавараў і прамысловых зьмяніліся на 100 : 80, бо прамысловых тавараў вытвараецца цяпер менш. Па ліку 100 адзінкам земляробскага тавару адказвае толькі 80 адзінак прамысловага; пры мене за 100 пудоў збожжа атрымліваем толькі 80 штук або пудоў фабрыкатаў. Пры мене тавараў заменная вартасьць 80 адзінак фабрыкатаў раўняецца вартасьці 100 адзінак зямельных прадуктаў. А такім чынам, адзінка фабрыкату будзе даражэйшая за адзінку збожжа, цана фабрычных тавараў будзе вышэйшая за цэны земляробскіх тавараў.

Апрача зьменшаньня агульнага ліку прамысловых тавараў, якое зьменшаньне ўздаражыла іх, цэны на прамысловыя тавары падняліся яшчэ дзякуючы ўзросту коштаў вытвару. Пасьля вайны ўсюды заведзены 8 гадзінны рабочы дзень, прадукцыйнасьць працы работніка, дзякуючы вайне, зьменшылася, а поступ тэхнікі так мала пашоў угару, што наагул кошты прамысловага тавару ўздаражэлі. Да ўздаражэньня прамысловага вытвару прычынілася социяльнае законадаўства для работнікаў, якое вельмі шыбка пашло



наперад, уключаючы на‘т страхоўку ад безработцьця. Масы безработных (у Англіі 1,3 мільёна, у Польшчы 213 тысячаў) *), якія перад вайной былі заняты, цяпер не працуюць, а ўтрымліваюцца часткова коштам прамысловасьці, а часткова коштам усіх працуючых іншых.

Апрача социяльнага законадаўства на ўзрост цэнаў прамысловых тавараў уплывае ць т. зван. дарагоўля капіталу. Пасьля вайны сільна ўзрасла працэнтная норма ад капіталаў, апрача таго падняўся ў процантах заработак прадпрыемніка. Прадпрыемнік цяпер не задавольваецца даваенным заработкам, сьпяшаецца магчыма якнайскарэй узбагацець, бо ня мае пэўнасьці, што істнуючыя ўмовы вытвару і палітычнага жыцьця зьяўляюцца на даўжэйшы час сталымі. Калі прадпрыемнік атрымлівае малы заработак з свайго інтарэсу, то ў кожную мінуту можа яго зьліквідаваць, а капітал перакінуць у іншую ґаліну вытвару. Адным словам, пры выбары поля працы прадпрыемнік лічыцца толькі з заработкам, які можа атрымліваць з свайго вытворства.

Зусім інакш стаіць справа з земляробскай вытворчасьцяй. Зьліквідаваць маёнтак, або гаспадарку і капітал перанесьці ў другую галіну вытворчасьці, ня так лёгка. Як тэхнічна і фармальна гэта трудна правясьці, так ізноў трудна знайсьці капітал, які-б ахвотна з прамысловага вытвару перайшоў на земляробскі. Апрача таго консэрватызм, традыцыі і вялікая прывязаннасьць гаспадара да зямлі не пазваляе яму лёгка расстацца з зямлёй і перайсьці да іншага вытвару. Прымушан ён з вялікай стратай астацца пры сваёй гаспадарцы, бо хаця яна і менш аплачваецца (або на‘т зусім не аплачваецца, а дае ць дэфіцыт), але зьяўляецца для яго менш рызыкоўнай, чым вытворчасьць прамысловая. Зьявішча дабравольнай парцэляцыі маёнткаў, якраз сьведчыць аб тым, што няма ніякага рахунку вясьці маёнтак, лепш яго распарцэляваць, бо гаспадар сам будзе працаваць чуць не 16 гадзін у дзень, каб зарабіць на мазольны кавалак хлеба, тады, як парабкі дамагаюцца социяльнага законадаўства.

Не гаворачы ўжо аб тым, што самастойны гаспадар працуе, не азіраючыся на ніякія гадзіны, ані на ніякія абмежаваньні працы жанчын і дзяцей, — што мае месца ў прамысловасьці,—парабак—земляробны работнік, — які працуе на чужой зямлі (як работнік на чужой фабрыцы), — знаходзіцца ў куды горшых умовах, чым прамысловы работнік. Перадусім жыцьцёвая норма работніка шмат перавышае жыцьцёвую норму парабка. Рэч ясная, гэта адбіваецца пасьля на коштах вытвару.

---

*) У канцы 1925 году.

загранічных валют, але залежыць ад іншых прычын, як: гаспадарчага стану краю, рэальнасьці дзяржаўнага бюджэту, экспартовых здольнасьцяў краю, платнага балянсу, цэнаў экспартовых тавараў, палітычных абставінаў, сьведамасьці грамадзян аб іх правох, даверыя да эмісыйнай інстытуцыі і інш. Чым вышэйшыя будуць цэны на экспартовыя тавары, тым лягчэй можа спасьці валюта.

Апрача таго з нізкімі цэнамі сваіх земляробскіх прадуктаў лягчэй можна конкураваць на замежных рынках, можна больш павялічыць вывазны контынгэнт і такім чынам павышаць актыўнасьць гандлёвага балянсу, што таксама падтрымлівае курс папяровай валюты.

Ды маем іншае зьявішча, якое яшчэ больш пагаршае земляробскаю прадукцыю; ім зьяўляецца прамысловы протэкцыянізм. Каб не дапускаць да краю чужаземных прамысловых тавараў, каб стварыць лепшыя варункі для краёвай прамысловасьці, ўрад увёў высокія мытныя стаўкі на замежныя прамысловыя тавары, іншымі словамі, пачаў апекавацца прамысловай вытворчасьцяй. Высокія мытныя (прогібіцыйныя) стаўкі і забарона прывозу некаторых тавараў шмат паднялі ўгару цэны прамысловых тавараў у параўнаньні з заграніцай.

Дзякуючы вышэй паданым абставінам, стварыліся некарысныя ўмовы для земляробскіх тавараў, якія апынуліся ў далёка горшых умовах як тавары прамысловыя. З прычыны вялікай розьніцы цэнаў між прамысловымі таварамі і земляробскімі, вясковае насяленьне ўтраціла сваю закупную сілу, а затым прамысловы прадукт пазбавіўся краёвых консумэнтаў.

І так, з аднэй стараны маем земляробскі крызыс, дзякуючы нізкім цэнам на земляробскія тавары, з другой — крызыс прамысловы, дзякуючы высокім цэнам на прамысловыя тавары і малой закупной здольнасьці вясковага насяленьня.

Адным словам, паўстае зачараванае кола, з якога трудна выйсьці.

Вялікія земляробскія прадуцэнты знаходзяць на гэта лекі ў павышэньні цэнаў на земляробскія тавары дарогай устанаўленьня мытнай абароны на земляробскі вытвар. Як толькі цэны на зямельныя прадукты пойдуць угару, падымецца закупная здольнасьць вёскі, пачне яна больш спажываць прамысловых тавараў, а ў зьвязку з гэтым прамысловая вытворчасьць кране з месца і ад'жыве гаспадарчае жыцьцё. Праціўнікі гэтай думкі ўзноў кажуць, што ад высокіх цэнаў на збожжа падымуцца кошты ўтрыманьня работнікаў, прамысловая вытворчасьць яшчэ больш падаражэе, а затым гаспадар зусім не павялічыць свае закупное здольнасьці.



Фактычна выхадам з гэтага палажэньня можа быць толькі павялічэньне агульнай сумы прамысловага вытвару, а так сама паніжэньне коштаў гэтага вытвару. Трэба, каб цэны прамысловых тавараў так многа спалі, каб земляробы маглі гэтыя тавары купляць за цану свайго вытворства. Тады консумцыя (спажыцьцё) прамысловых прадуктаў павялічыцца, павялічыцца закупная здольнасьць гаспадара. Наагул, усялякая вытворчасьць толькі тады мае рацыю да расшырэньня свайго поля працы, калі будзе расшырацца консумцыя, калі прапарцыянальна да яе ўзросту будзе павялічвацца грамадзкі даход — даход грамадзкіх масаў, у нашым выпадку (ў Польшчы) — даход сялянскіх масаў.

## § 26. Сындыкаты.

Эканамічныя крызысы і конкурэнцыйная барацьба накланіла прадуцэнтаў і гандляроў да заключаньня дагавораў для ўхіляньня конкурэнцыі. Такія змовы продуцэнтаў называюцца сындыкатамі; выступаюць яны ў дзьвюх формах: **картэлі і трэсты**. Картэль ёсьць найпрасьцейшай формай саюзу прадуцэнтаў. Картэль, пакідаючы кожнаму прадпрыемніку яго ўнутраную самастойнасьць, абмяжоўваецца да саюзу з мэтай дасягненьня магчыма найлепшых варункаў пры прадажы прадуктаў. У зьвязку з гэтым імкнецца яна да ўнармаваньня конкурэнцыі, пры помачы такіх сродкаў:

1. Раёнаваньне збыту, г. зн. прызнаньне кожнаму з саюзных прадпрыемстваў выключнага права прадажы сваіх прадуктаў на пэўных рынках, а дык запэўненьне гэтым прадпрыемствам тэрыторыяльнага манаполю.

2. Контынгенаваньне вытвару, г. зн. вызначэньне высокасьці вытворства, для кожнага прадпрыемства, якой ня можна перавысіць.

3. Вызначэньне цаны, па якой мусяць прадаваць тавары ўсе прадпрыемствы.

4. Дзеля таго, што вышэй сказаныя сродкі, паміма дагаворных караў, аказаліся ня сусім практычнымі, трэба было шукаць новага сродку. Прышлося адкінуць беспасрэдны стык прадпрыемніка з набыўцом і ўвясьці прынцып прымусовага пасрэдніцтва картэлі пры прадажы прадуктаў.

**Трэст** (з ангельскага азначае давяраць) пашоў яшчэ далей у кірунку концэнтрацыі і манаполю, бо палягае не на саюзе, але на злучэньні ўсіх прадпрыемстваў у адно.

Гэтае лучэньне прадпрыемстваў паўставала ў розных формах і найбольш разьвілося ў Амэрыцы (Зл. Штаты).

1. Адной з формаў трэстаў была сыстэма еднасьці або **консолідацыі**, палягаючай на злучэньні ўсіх прадпрыемстваў у адно. З гэтай мэтай ацэнена вартасьць кожнага прадпры-

емства і выплачана яе ўласьніку акцыямі новай супалкі, г. з. трэсту. У выпадку патрэбы некаторыя прадпрыемствы нават закрываюцца.

2. Калі паўстаў закон, забараняючы такі спосаб манаполю, то трэсты выступілі пад новай формай з назовам Holding Trust (трэст апёрты на ўласнасьці). Гэтая форма пакідае кожнаму прадпрыемству фармальную і номінальную самастойнасьць, але касуе яе фактычна тым, што адно з іх закупілівае большасьць акцыяў усіх іншых. Дзякуючы гэтаму, гэтае прадпрыемства мае рашучы ўплыў на ўрад кожнага іншага, і фактычна кіруе ўсімі.

Трэсты і картэлі ёсьць арганізацыямі прадпрыемнікаў даволі новымі і паўсталі ў канцы прошлага сталецьця. Узрастаючая іх лічба і вялізарныя разьмеры выклікаюць здумленьне. Усё робіцца прадметам трэсту: газа, сталь, чугункі, караблі і г. д. Сацыялістыя бачаць у іх апошняе слова капіталізму, пасьля якога наступе толькі колектывізм. Староньнікі лібэральнай школы заклапатаны такімі вынікамі вольнай конкурэнцыі, ня трацяць аднак надзеі, што вольнасьць, якая стварыла трэсты, з часам прывядзе іх да ўпадку, або зробіць іх няшкоднымі.

Прамысловыя сындыкаты з пункту гледжаньня карысьці для грамадзкай гаспадаркі маюць свае пажаданыя і непажаданыя рэзультаты. За сындыкатамі прамаўляюць два важнейшыя аргумэнты:

1. Зьмяньшэньне коштаў вытворства, што зьяўляецца гаспадарчым поступам. Адпадаюць выдаткі на конкурэнцыйную рэкляму, зьмяншаюцца выдаткі на разьезды комівояжэраў. Сюды таксама належыць закрываньне прадпрыемстваў, працуючых у горшых варунках.

2. Утрыманьне раўнавагі паміж вытворствам і кансумцыяй, чым спыняюцца гаспадарчыя крызысы і ўсталяюцца цэны. Староньнікі трэстаў нават кажуць, што трэсты вядуць да паніжэньня цэнаў, а палітыка іх не дапушчае вялікіх скокаў у цэнах.

Ня менш важныя закіды робяць трэстам. Ёсьць рэчай малавернай, каб якая-небудзь магутнасьць экацамічная ці палітычная, не трапляючы на ніякія перашкоды, ня выкарыстоўвала свае сілы выключна для сябе.

1. Абніжаючы нават троха цэны, трэсты і картэлі, будучы фактычна манаполем, перадусім забясьпечваюць свае інтарэсы і зьбіраюць маемасьць для акцыянэраў.

2. Некаторыя трэсты ня толькі не панізілі цэнаў, але яшчэ іх паднялі. Так было з мясным трэстам у Чыкаго (Амэрыка).

3. Трэсты забіваюць усялякую конкурэнцыю няпраўнымі сродкамі, лепшасьцю свае арганізацыі і зьберагальнасьцю ў вытварстве,—а проста разбойніцкімі сродкамі — вялікім часовым паніжэньнем цэнаў і подступамі пры перавозе чугункай тавараў.



4. Будучы фактычна манаполем, трэсты могуць зусім не клапаціцца аб поступе тэхнікі вытворства і аб сталым і паступовым паніжэньні цэнаў, што якраз зьяўляецца першай задачай вольнай конкурэнцыі.

5. Урэшце, прамысловыя сындыкаты могуць быць шкоднымі з прычынаў палітычнага характару.

Правадаўства аб прамысловых сындыкатах яшчэ аканчальна не ўстаноўлена, шмат якія дзяржавы трактуюць іх няпрыязна, а дзеля таго сындыкаты выступаюць часам у скрытай форме.

## § 27. Коопэратыўнае вытворства.

Пры капіталістычным спосабе вытворства, як ужо бачылі раней, мае вялізную перавагу капітал, які фактычна зьяўляецца гаспадаром прадукцыі.

Коопэратыўнае вытворства мае на мэце зьмяньшэньне перавагі капіталу над працай. Коопэрацыяй называем арганізаваньне адзінак з мэтай задаваленьня сваіх матар'яльных і духовых патрэбаў.

Коопэрацыя ў прамысловым вытворстве разьвілася дагэтуль вельмі мала. Магчыма, што коопэратыўнае вытворства разаўецца з бегам часу, як грамадзянства пяройдзе праз школу спажывецкае і крэдытнае коопэрацыі.

Найбольш разьвілася вытворчая коопэрацыя ў галіне земляробства. Супалкі, якія маюць на мэце земляробскае вытворства на коопэратыўных асновах, г. зн. дзяленьня даходу адносна да асабістага ўдзелу, яшчэ досіць рэдкія. Спатыкаем, аднак-жа, прыклады земляробскай коопэрацыі, якая не ўваходзіць у галіну гандлёвай коопэрацыі; да іх належаць: мэльёрацыйныя супалкі, машыновыя супалкі і гадаўляныя. Мэльёрацыйныя супалкі маюць на мэце палепшаньне супольнымі сіламі мала ўраджайнае зямлі. Тыповым прыкладам такіх супалак зьяўляецца залажэньне ў Даніі ў 1866 г. „Таварыства культуры ялавых ютляндзкіх раўнін", якое прычынілася да залясеньня няўжыткаў. Машыновыя супалкі маюць на мэце купляньне дробнымі гаспадарамі земляробных прыладаў і машын, якія або недаступны для аднаго, або мала для аднаго карысны, (малатарні, сеялкі). Такія супалкі найбольш разьвіліся ў Баварыі. Гадаўляныя супалкі маюць на мэце завядзеньне лепшых расаў быдла і іншай жывёлы. Аднак коопэрацыя ў вытворстве цяпер мае характар больш гандлёвы.

Табліца 1.

# Статыстычныя даныя.

Агульнае разьвіцьцё капіталістычнай гаспадаркі ў цыфрах (у працягу XIX і XX ст. ст.).

| Год | Насяленьне ўсяго сьвету ў мільёнах | Гандлёвы абарот | | ВЫТВАР | | | КАМУНІКАЦЫЯ | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | У мільёнах даляраў | У далярах на душу насяленьня | Вугаль мільён. тон. | Жалеза мільёнаў тон. | Бавоўна у мільен. англьскіх фунтаў | Тоннаж паров. караблеў у тысяч. тон. | Даўжыня чугуначн. ліній у тысячных англьск. міль | Даўжыня тэлеграф. ліній у англьск. мілях |
| 1800 | 640 | 1479 | 2,31 | 11,6 | 0,8 | 520 | — | — | — |
| 1820 | 780 | 1659 | 2,13 | 17,2 | 1,0 | 630 | 20 | — | — |
| 1830 | 847 | 1981 | 2,34 | 25,1 | 1,8 | 20 | 111 | 0,2 | — |
| 1840 | 950 | 2789 | 2,93 | 44,8 | 2,7 | 1310 | 368 | 5,4 | — |
| 1850 | 1075 | 4049 | 3,76 | 81,4 | 4,7 | 1435 | 864 | 24,0 | 5 |
| 1860 | 1205 | 7246 | 6,01 | 142.3 | 7,2 | 2551 | 1710 | 139,9 | 100 |
| 1870 | 1310 | 10663 | 8,14 | 213,4 | 11,9 | 2775 | 3040 | 224,9 | 281 |
| 1880 | 1439 | 14761 | 10,26 | 340,0 | 18,0 | 3601 | 5880 | 390.0 | 440 |
| 1890 | 1488 | 17519 | 11,80 | 466,0 | 27,2 | 5600 | 8265 | 500,0 | 763 |
| 1900 | 1543 | 20105 | 13,02 | 800,0 | 40,4 | 6247 | 13857 | 564,0 | 1180 |
| 1910 | 1616 | 33634 | 20,81 | 1141,6 | 65,8 | 9013 | 22046 | 666,0 | 1307 |
| 1915 | 1672 | 31302 | 18,72 | 1169,6 | 63,4 | 8826 | 28160 | 717,5 | 1526 |
| 1920 | 1830 | 61277 | 33,49 | 1305,0 | 68,3 | 9409 | 32092 | 710,6 | 1592 |



Табліца 2.

## Паказальнік закупнай сілы земляробскіх прадуктаў у Польшчы*).

Год 1914 — 100 Год 1922 — 1925.

Аблічаны на аснове паказальнікаў гуртовых цэнаў (Табліца 10).

| Год і месяц | Паказальнік | Год і месяц | Паказальнік |
|---|---|---|---|
| 1922 г. студзень | 83,5 | 1924 г. студзень | 93.3 |
| люты | 67,8 | люты | 84,4 |
| сакавік | 84,8 | сакавік | 81,1 |
| красавік | 85,3 | красавік | 79,1 |
| травень | 79.2 | травень | 75,9 |
| чэрвень | 83,9 | чэрвень | 74,8 |
| ліпень | 94,9 | ліпень | 85,7 |
| жнівень | 66,8 | жнівень | 98,0 |
| верасень | 71,7 | верасень | 109,4 |
| кастрычнік | 65,6 | кастрычнік | 111,1 |
| лістапад | 61,1 | лістапад | 112,2 |
| сьнежань | 80,3 | сьнежань | 110,7 |
| Сярэдні за 1922 г. | 77,1 | Сярэдні за 1924 г. | 93,0 |
| 1923 г. студзень | 76,5 | 1925 г. студзень | 117,9 |
| люты | 73,1 | люты | 117,4 |
| сакавік | 79,9 | сакавік | 117,7 |
| красавік | 84,1 | красавік | 113,6 |
| травень | 79,0 | травень | 119,0 |
| чэрвень | 54,5 | чэрвень | 121,2 |
| ліпень | 49,2 | ліпень | 112,2 |
| жнівень | 52,4 | жнівень | 100,0 |
| верасень | 54,8 | верасень | 95'4 |
| кастрычнік | 37,5 | кастрычнік | 96,6 |
| лістапад | 45,7 | лістапад | 90,6 |
| сьнежань | 59,8 | сьнежань | 97,7 |
| Сярэдні за 1923 г. | 62,2 | Сярэдні за 1925 г. | 108,3 |

*) Закупная сіла земляробскіх прадуктаў адносна да сыр'я і матэр'ялаў валакнянага промыслу, мэталяў і вугля.

Паказальнікі аблічаны аўтарам на аснове даных з: „Rocznik Ministerstwa Skarbu za 1924 r. i Kwartalniki Główn. Urzędu Statyst. za r. 1925".

**Табліца 3.**

## „Нажніцы“ у СССР.*).

Адносіны цяперашніх цэн земляробскіх прадуктаў і прамы-
словых вырабаў да перадваенных цэнаў, (агульны індэкс = 1)
паводле даных Усерасейскага гуртовага паказальніка „Гос-
плана“.

| Число | Земляробскія прадукты | Прамысловыя вырабы | Жыта | Паркаль |
|---|---|---|---|---|
| 1 студня 1922 г. | 1,16 | 0,85 | 1,12 | 1,25 |
| 11 „ „ | 1,13 | 0,88 | 1,07 | 1,37 |
| 21 „ „ | 1,07 | 0,93 | 1,01 | 1,53 |
| 1 верасьня „ | 1,03 | 0,97 | 1,00 | 1,48 |
| 11 „ „ | 1,00 | 1,00 | 0,99 | 1,60 |
| 21 „ „ | 0,98 | 1,02 | 0,98 | 1,80 |
| 1 кастрычніка „ | 0,95 | 1,05 | 0,96 | 1,83 |
| 11 „ „ | 0,92 | 1,08 | 0,96 | 1,95 |
| 21 „ „ | 0,90 | 1,12 | 0,94 | 2,18 |
| 1 лістапада „ | 0,89 | 1,13 | 0,95 | 2,16 |
| 11 „ „ | 0,92 | 1,10 | 0,96 | 2,18 |
| 21 „ „ | 0,90 | 1,12 | 0,95 | 2,30 |
| 1 сьнежня „ | 0,87 | 1,17 | 0,83 | 2,86 |
| 11 „ „ | 0,85 | 1,20 | 0,80 | 2,67 |
| 21 „ „ | 0,83 | 1,23 | 0,78 | 2,85 |
| 1 студня 1923 г. | 0,82 | 1,24 | 0,74 | 2,69 |
| 11 „ „ | 0,80 | 1,27 | 0,71 | 2,67 |
| 21 „ „ | 0,78 | 1,30 | 0,71 | 2,61 |
| 1 лютага „ | 0,78 | 1,31 | 0,68 | 2,52 |
| 11 „ „ | 0,76 | 1,34 | 0,68 | 2,52 |
| 21 „ „ | 0,76 | 1,34 | 0,69 | 2,51 |
| 1 сакавіка „ | 0,76 | 1,34 | 0,69 | 2,55 |
| 11 „ „ | 0,76 | 1,34 | 0,69 | 2,54 |
| 21 „ „ | 0,74 | 1,38 | 0,66 | 2,59 |
| 1 красавіка „ | 0,72 | 1,43 | 0,63 | 2,81 |
| 11 „ „ | 0,71 | 1,44 | 0,62 | 2,96 |

*) „Хозяйственная Коньюнктура“ проф. С. А. Первушин, Москва 1925 г



| Число | Земпяр. прадукты | Прамысловыя вырабы | Жыта | Паркаль |
|---|---|---|---|---|
| 21 красав. 1923 г. | 0,68 | 1,50 | 0,60 | 3,25 |
| 1 траўня „ | 0,67 | 1,53 | 0,58 | 3,28 |
| 11 „ „ | 0,66 | 1,56 | 0,59 | 3,31 |
| 21 „ „ | 0,66 | 1,56 | 0,60 | 3,33 |
| 1 чэрвеня „ | 0,66 | 1,54 | 0,59 | 3,53 |
| 11 „ „ | 0,67 | 1,52 | 0,65 | 3,15 |
| 21 „ „ | 0,69 | 1,48 | 0,69 | 2,85 |
| 1 ліпня „ | 0,70 | 1,45 | 0,68 | 2,79 |
| 11 „ „ | 0,68 | 1,50 | 0,66 | 2,72 |
| 21 „ „ | 0,67 | 1,52 | 0,60 | 2,95 |
| 1 жніўня „ | 0,65 | 1,57 | 0,53 | 2,93 |
| 11 „ „ | 0,62 | 1,61 | 0,51 | 3,05 |
| 21 „ „ | 0,59 | 1,64 | 0,51 | 3,07 |
| 1 верасьня „ | 0,56 | 1,68 | 0,48 | 3,15 |
| 11 „ „ | 0,54 | 1,70 | 0,46 | 3,23 |
| 21 „ „ | 0,54 | 1,71 | 0,47 | 3,20 |
| 1 кастрычніка | 0,54 | 1,72 | 0,46 | 3,16 |
| 11 „ „ | 0,56 | 1,68 | 0,48 | 2,65 |
| 21 „ „ | 0,57 | 1,67 | 0,49 | 2,67 |
| 1 лістапада „ | 0,59 | 1,65 | 0,53 | 2,64 |
| 11 „ „ | 0,61 | 1,61 | 0,55 | 2,64 |
| 21 „ „ | 0,63 | 1,59 | 0,55 | 2,58 |
| 1 сьнежня „ | 0,67 | 1,54 | 0,57 | 2,51 |
| 11 „ „ | 0,69 | 1,52 | 0,59 | 2,52 |
| 21 „ „ | 0,72 | 1,49 | 0,62 | 2,52 |
| 1 студня 1924 г. | 0,74 | 1,47 | 0,63 | 2,50 |